

КОЛЬКІ ДАЎГАБУДАЎ У СТАЛІЦЫ?

2

У НЯЎДАЧАХ ДЗЯЦЕЙ ВІНАВАТЫЯ БАЦЬКІ



Сямейная газета

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 САКАВІКА 2021 г. ЧАЦВЕР № 41 (29410)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар ПЕТРЫШЭНКА, намеснік прэм'ер-міністра:**

*«Нашы студэнты павінны рэалізоўваць свае творчыя здольнасці, маладыя людзі павінны браць актыўны ўдзел і ў грамадскім жыцці ВНУ. Не толькі выкладчыкі фарміруюць ВНУ, але і студэнты ўдзельнічаюць у гэтым. Яны фарміруюць традыцыі. Вельмі важна, што ў кожным універсітэце ёсць свае традыцыі, ёсць прадметны і ўзаемапаважлівы дыялог паміж прафесарска-выкладчыцкім складам і студэнтамі. Гэтыя традыцыі павінны развівацца, дапаўняцца новымі фарматамі».*

# МУЖНАСЦЬ, СТОЙКАСЦЬ І ПРАФЕСІЯНАЛІЗМ

Супрацоўнікам і ветэранам органаў унутраных спраў Рэспублікі Беларусь

***Паважаныя таварышы!***

*Віншую вас з прафесійным святам — Днём міліцыі.*

*Кожны з вас штодня знаходзіцца на пярэднім краі барацьбы са злачыннасцю, справай даказваючы адданасць краіне і народу, захоўваючы пры гэтым прыхільнасць да слаўных традыцый, якія былі закладзены ветэранамі службы.*

*Асабліва выразна важнасць органаў правапарадку ў забеспячэнні стабільнасці ў нашым грамадстве і бяспекі грамадзян выявілася летась. Гэта, безумоўна, быў адзін з самых складаных перыядаў у біяграфіі беларускай міліцыі. Аднак вы дастойна справіліся з замахамі на канстытуцыйны лад дзяржавы. Да канца выканалі свой абавязак, праявіўшы мужнасць, стойкасць і высокі прафесіяналізм, паказалі сябе сапраўднымі патрыётамі.*

*Перакананы, вы і ў далейшым будзеце рабіць усё магчымае для таго, каб надзейна абараніць прававыя асновы дзяржаўнага ладу, нейтралізаваць выклікі і пагрозы для эканомікі і мірнага жыцця беларусаў.*

*Дзякую за сумленную, бездакорную службу.*

*Жадаю вам моцнага здароўя, шчасця і дабрабыту.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота БелТА.

## КОРАТКА

- Колькасць рэзідэнтаў Парка высокіх тэхналогій перавысіла 1 тысячу.
- **Беларусбанк аднавіў выдачу крэдытаў на спажывецкія патрэбы.**
- Тэмпература паветра ў Беларусі ў лютым была ніжэйшая за норму на 2,2 градуса.
- **Ратавальнікі правядуць цеплавую здымку з верталёта для праверкі цепласетак Мінска.**
- У Беларусі прыкладна 60 % сем'яў з дзецьмі выхоўваюць толькі адно дзіця.
- **У Гомельскай вобласці завершана ўкараненне інстытута ўрача агульнай практыкі.**
- «Белпошта» да 8 Сакавіка даставіць паштоўкі бясплатна.
- **«Белавія» працягнула прыпыненне рэйсаў у Ашгабад да 5 красавіка.**
- Конкурс на суісканне прэміі Нацыянальнай акадэміі навук аб'яўлены ў Беларусі.

ISSN 1990 — 763X

Нацыянальны здабытак

# СКАРБНІЦА ДЗІКАЙ ПРЫРОДЫ

### Беларускія лясы дазваляюць захоўваць і рацыянальна выкарыстоўваць значныя прыродныя рэсурсы

**Якія дасягненні ў справе абароны лясоў адбыліся за апошнія гады і якія лясныя праблемы сёння трэба вырашаць, учора, у Сусветны дзень дзікай прыроды, расказалі спецыялісты лясной гаспадаркі, аховы прыроды і навукоўцы.**

## Зрабіць лясы больш устойлівымі

**Сяргей САЗОНАЎ, кансультант упраўлення ляснай гаспадаркі Міністэрства ляснай гаспадаркі,** адзначыў, што сёння лясістасць нашай краіны складае больш за 40 %. Гэта максімальны паказчык больш чым за стагадовы перыяд нашай гісторыі. Па шэрагу ключавых паказчыкаў Беларусь уваходзіць у першую дзясятку лясных дзяржаў Еўропы.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

СТАР. 4

Спажывец

# ЖЫВЁМ, ХЛЕБ ЖУЁМ

### Які хлеб любяць у Беларусі?

**У савецкія часы гандаль прапаноўваў пакупніку абмежаваны асартымент хлебабулачных вырабаў. У 1980-я нават у буйных крамах было ўсяго 3-4 найменні хлеба. А часцей за ўсё — ямчэ прасцей: хлеб і батон. Адпраўляючы па хлеб, маці казала: купі чорнага. І ўсё зразумела: чорны — ён і ёсць чорны, якія тут могуць быць акалічнасці?**

СТАР. 13



Новыя гатункі хлеба распрацоўваюцца з улікам нормаў здаровага харчавання. Пакупнікам сёння прапаноўваецца бездражджавы хлеб, гатункі з цэльным зернем, ільняным насеннем, з мукой з тапінамбура, спецыямі, вотруб'ем, аўсянымі, жытнімі і грачанымі шматкамі і іншымі карыснымі дабаўкамі. І нават з марской капустай!

Ва ўрадзе

# ВЖКГ І БУДАЎНІЦТВА

## Колькі даўгабудаў у сталіцы і калі ўсе мінчане будуць піць артэзіянскую ваду з-пад крана?

**Міністры жыллёва-камунальнай гаспадаркі і архітэктуры і будаўніцтва Андрэй ХМЕЛЬ і Руслан ПАРХАМОВІЧ перад пасяджэннем Прэзідыума Саўміна расказалі пра леташнія вынікі работы ведамстваў і задачы на бягучы год.**

Па словах Руслана Пархамовіча, у 2020 годзе былі выкананы сацыяльныя паказчыкі ў будаўніцтве па кошце квадратнага метра і ўводзе жылля з дзяржаўнай падтрымкай, усе жылыя дамы будуюцца толькі ў энергаэфектыўным выкананні.

Ён адзначыў станоўчыя вынікі дзейнасці будаўнічых арганізацый — летась сярэдняя рэнтабельнасць па галіне склала 7 %, прыбытак вырас на 48 %. «Таксама нядрэнны тэмп росту заработнай платы — 113 працэнтаў у будаўнікоў. Таму мы не адстаём, у цэлым па краіне», — дадаў Руслан Пархамовіч.

Сёлета асаблівы акцэнт ведамства, па словах яго кіраўніка, зробіць на незавершаных будаўнічых аб'ектах, рынках арэнднага жылля, электражыллі, на комплекснай індывідуальнай жыллёвай забудове.

Па стане на 1 студзеня, у краіне 25 даўгабудаў сярод жылых дамоў — адзін з іх на Віцебшчыне, астатнія ў сталіцы.

«Асноўнымі прычынамі незавершанага будаўніцтва ў Мінску з'яўляецца адсутнасць інжынерна-транспартнай інфраструктуры да ўжо пабудаваных жылых дамоў. Безумоўна, ёсць шэраг аб'ектаў, якія сапраўды даўгабуды, што сфарміраваліся з-за несумленнага выканання забудоўшчыкамі сваіх абавязкаў у рамках будаўніцтва з жыллёвымі аблігацыямі», — тлумачыць кіраўнік ведамства. Ён дадаў, што паводле інфармацыі Мінгарвыканкама, ужо ў першым паўгоддзі 2021-га колькасць такіх аб'ектаў скароціцца на траціну.

Кошт «квадрата» з дзяржпадтрымкай сёлета не павінен перавысіць 1152 рублі, і, як падкрэслівае міністр, гэты паказчык будзе вытрыманы.

«У мінулым годзе суадносіны цаны квадратнага метра і заработнай платы склалі па краіне 0,84. Я думаю, не больш за адзінку, нягледзячы на праблемы з ростам кошту імпартных матэрыялаў, вытрымаем. У бягучым годзе плануецца пабудаваць мільён квадратных метраў жылля з дзяржпадтрымкай», — сказаў Руслан Пархамовіч.

Асноўным рухавіком экспарту паслуг, як падзяліўся міністр, застаецца холдынг «Белбудцэнтр», які зараз рыхтуе пяць сацыяльных аб'ектаў (школы і дзіцячыя садкі) у Ленінградскай і Калужскай абласцях Расіі.

«Калі ўсе планы здзейсняцца, да канца 2025 года мы плануем рэалізаваць больш за 12 такіх аб'ектаў (сацыяльных. — **«Зв.»**) на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі. Жыллё — асобная тэма. Па ёй працуюць і шэраг буйных мінскіх забудоўшчыкаў, і гомельскі ДБК. Мы пастаянна павялічваем колькасць беларускіх падрадчыкаў на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі», — канстатаваў міністр архітэктуры і будаўніцтва.

Міністр жыллёва-камунальнай гаспадаркі Андрэй Хмель, адказваючы на пытанні журналістаў, заявіў, што жыхары краіны вельмі патрабавальныя да якасці аказання паслуг і ведамства імкнецца адпавядаць трэндам.

«У мэтах выканання даручэння кіраўніка краіны ў рамках нарады, якая праходзіла ў Полацку, арганізавана служба 115, дапрацавана яе дзейнасць. Сёння мы бачым яе запатрабаванасць грамадзянамі. Заяўкі паступаюць у вялікай колькасці. Важна адзначыць, што па выніках года колькасць зваротаў грамадзян знізілася на 7,5 працэнта. Гэта гаворыць аб тым, што якасць аказання жыллёва-камунальных паслуг вырасла», — сказаў міністр ЖКГ.

Задача пераводу краіны на падземныя крыніцы вады, як ён паведаміў, стаіць на гэту пяцігодку. Забеспячэнне беларусаў якаснай пітной вадой — асноўная сярод задач, якія вырашаюцца сёння Міністэрствам ЖКГ.

«Мы бачым перавагі і недахопы. Але самае важнае, каб выкараніць недахопы, — зрабіць больш жорсткімі і ўдасканаліць наглядныя функцыі над якасцю аказання паслуг. Галоўнае, каб насельніцтва атрымлівала якасныя паслугі па даступных, празрыстых тарыфах. Асноўная задача — папярэдзіць звароты грамадзян, выканаць якасна свае абавязкі, каб звароты не ўзнікалі. Таму будзе абмяркоўвацца стварэнне заказчыкаў у выглядзе тэхнічнага нагляду», — канстатаваў Андрэй Хмель.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Энергетыка

# МІРНЫ АТАМ У ЗАКОНЕ

## Нарматыўная іерархія і радыяцыйная бяспека

**Неабходнасць стварэння ў Беларусі ядзернага права, сістэма нарматыўна-прававых актаў у галіне рэгулявання ядзернай і радыяцыйнай бяспекі і падрыхтоўка новага Закона «Аб рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі» — пра гэтыя і іншыя моманты расказалі эксперты падчас брыфінгу ў БелТА.**




### Рэгуляванне і ліцэнзаванне

Сістэма нарматыўна-прававых актаў Беларусі ў галіне рэгулявання ядзернай і радыяцыйнай бяспекі прадстаўляе сабой класічную піраміду, уверсе якой знаходзяцца міжнародныя канвенцыі і дагаворы.

— Сістэма нарміравання і рэгулявання ў галіне ядзернай і радыяцыйнай бяспекі краіны пачала складвацца яшчэ ў савецкія часы. Па шэрагу міжнародных дакументаў наша дзяржава стала пераемніцай міжнародных пагадненняў, якія былі прыняты ў СССР і пазней ратыфікаваны ў межах Рэспублікі Беларусь, — абазначыў **Рыгор АСТАШКА, намеснік начальніка Дзяржатамнагляда.**

На наступнай прыступцы — акты найвышэйшай заканадаўчай сілы: законы Беларусі.

— На заканадаўчым узроўні сістэма краіны пачала фарміравацца ў 1998 годзе, калі ў незалежнай Беларусі з'явіўся Закон «Аб радыяцыйнай бяспецы насельніцтва». Ён быў падрыхтаваны на падставе мадэльнага закона, распрацаванага ў межах СНД. Перыядычна ў яго ўносілі змяненні, у прыватнасці, калі ў 2008-м з'явіўся Закон «Аб выкарыстанні атамнай энергіі» (пасля прыняцця рашэння аб будаўніцтве АЭС), — дадаў Рыгор Асташка.

Сярод значных заканадаўчых актаў **Алена ЖЫГАЛКА, начальнік сектара прававога забеспячэння Дзяржатамнагляда** акрэсліла, напрыклад, Указ № 62 ад 2015 года «Аб забеспячэнні бяспекі пры збудаванні і эксплуатацыі Беларускай атамнай станцыі». У ім абазначаны пытанні арганізацыі нагляду, уведзены такі інстытут, як грамадскія слуханні, прадугледжана магчымасць карэкціроўкі тэрмінаў экспертызы бяспекі ў залежнасці ад аб'ёму прадстаўленых дакументаў. А таксама Указ № 450 ад 2010 года, які зацвердзіў палажэнні аб ліцэнзаванні.

— Цяпер рыхтуецца новы закон аб ліцэнзаванні, і ў межах гэтага працэсу Дзяржатамнагляд выходзіць з агульнага рэгулявання. Новы ўказ, якім будзе зацверджана палажэнне аб ліцэнзаванні дзейнасці ў галіне выкарыстання атамнай энергіі і крыніц іанізавальнага выпраменьвання, ужо падрыхтаваны і ўнесены на разгляд у Адміністрацыю Прэзідэнта. Гэты ўказ мае комплексны характар і прадугледжвае карэкціроўку Указа № 1 ад 1999 года, якім зацверджаны адзіны прававы класіфікатар. На жаль, цяпер у гэтым класіфікатары адсутнічае такая галіна, як заканадаўства аб ядзернай бяспецы, а заканадаўства аб радыяцыйнай бяспецы падпарадкоўваецца заканадаўству аб ахове навакольнага асяроддзя. Па ўзгадненні з Нацыянальным цэнтрам прававой інфармацыі на дадзеным этапе ў нас будзе асобная самастойная галіна, — расказала эксперт.

### Актуальнасць дакументаў часоў СССР і рэвізія расійскіх ТНПА

Наступная прыступка піраміды — пастановы Саўміна. Адны з самых важных для атамнай галіны датычацца экспертызы дакументаў і парадку правядзення дзяржнагляду. У прыватнасці, пастанова Саўміна 2015 г. № 133, якая прад'яўляе дэталёвыя патрабаванні да парадку правядзення нагляду непасрэдна на атамнай станцыі.

Пастановы МНС — чарговыя ў іерархіі. Гэтымі дакументамі зацвярджаюцца нарматыўныя прававыя акты, у тым ліку інструкцыі, якія датычацца парадку навучання і праверкі ведаў; уліку і кантролю крыніц іанізавальнага выпраменьвання; крытэрыяў аднясення гэтых крыніц да катэгорый па ступені радыяцыйнай небяспекі.

Пастановы датычацца таксама ТНПА: нормаў і правілаў па забеспячэнні ядзернай і радыяцыйнай бяспекі, а таксама кіраўніцтваў па бяспецы.

— У Беларусі дзейнічаюць 25 пастаноў МНС, якімі зацверджаны 39 нормаў і правілаў у галіне забеспячэння ядзернай і радыяцыйнай бяспекі. Для забеспячэння бяспекі непасрэдна на БелАЭС распрацавана 29 нормаў і правілаў, а адпаведным Указам Прэзідэнта ад 2010 года на перыяд збудавання станцыі дапускаецца выкарыстанне расійскіх ТНПА ў галіне атамнай энергіі. Карыстаюцца таксама правіламі і нормамі, якія створаны яшчэ ў СССР, — распавёў **Дзмітрый ПАЎЛАЎ, начальнік аддзела навукі і інфармацыі Дзяржатамнагляда.** — Гэта не азначае, што дакументы неактуальныя. Наадварот, у той час яны былі настолькі добра падрыхтаваныя, што дагэтуль не страцілі актуальнасць.

Разам з тым, з нагоды плануемага ўводу ў эксплуатацыю першага энергаблока была праведзена рэвізія пераліку тэхдакументаў Расіі. Асноўная іх частка ўжо перапрацавана і зацверджана пастановамі. Астатнія — на ўзгадненні і будуць прынятыя ў найбліжэйшы час.

### Дзеючыя і новыя

Беларусь — удзельніца большасці канвенцый у галіне ядзернай бяспекі. У прыватнасці Канвенцыі аб ядзернай бяспецы 1994 года, Аб'яднанай канвенцыі аб бяспечным абыходжанні з адпрацаваным ядзерным палівам і бяспецы абыходжання з радыеактыўнымі адходамі 1997 года, а таксама Венскай канвенцыі аб грамадзянскай адказнасці за ядзерную шкоду 1963-га і іншых. Цяпер у краіне дзейнічаюць два базавыя законы: «Аб радыяцыйнай бяспецы» і «Аб выкарыстанні атамнай энергіі», расказала Алена Жыгалка:

— Закон «Аб радыяцыйнай бяспецы» ўступіў у сілу ў чэрвені 2020-га. Сярод асноўных яго навел — устанаўленне дыферэнцыраванага падыходу ў залежнасці ад ступені бяспекі крыніцы, вызначэнне сістэмы нармавання, ТНПА ў галіне забеспячэння радыяцыйнай бяспекі. Гэтым законам быў уведзены новы інстытут кансультавання ў галіне ядзернай бяспекі. А таксама адміністрацыйная працэдура — рэгістрацыя тыпаў крыніц іанізавальнага выпраменьвання.

З моманту прыняцця Закона «Аб выкарыстанні атамнай энергіі» прайшло ўжо 13 гадоў. Змяненні, унесеныя ў гэты дакумент у 2011-м, былі кропкавыя і неканцэптуальныя. Разам з тым, рэалізацыя праекта па стварэнні БелАЭС і маючы адбыцца этап яе эксплуатацыі паскорылі працэс карэкціроўкі гэтага закона, падкрэсліла яна:

— Пунктам 21 Плана падрыхтоўкі законапраектаў на 2021 год прадугледжана падрыхтоўка новага Закона «Аб рэгуляванні бяспекі пры выкарыстанні атамнай энергіі». Прыярытэт у гэтым законапраекце будзе скіраваны менавіта на забеспячэнне бяспекі. У дакуменце таксама будуць максімальна ўлічаны рэкамендацыі і прапановы па выніках місій МАГАТЭ.

Па выніках міжнародных місій МАГАТЭ ў дачыненні да нашага заканадаўства сур'ёзных нараканняў няма. Аднак ядзернае права неабходна ўдасканальваць, удакладніў Рыгор Асташка:

— Усе тыя моманты, якія, на думку і МАГАТЭ, і міжнароднай суполкі ў цэлым, павінны быць дакладна прапісаны, будуць празрыста абазначаны ў адзіным дакуменце. У прыватнасці, вызначаць сферу адказнасці эксплуатуючай арганізацыі за наступствы дзейнасці, якая ажыццяўляецца ёй. А таксама пытанні, звязаныя з рэгуляваннем ядзернай і радыяцыйнай бяспекі. У Палату прадстаўнікоў гэты законапраект трапіць у сакавіку 2022-га.

Мяркуецца, што ў найбліжэйшыя два гады праграму развіцця ядзернага права ўключаць у праект нацыянальнай палітыкі ў галіне ядзернай і радыяцыйнай бяспекі, якая будзе падрыхтавана ў межах дзяржпраграмы. А сёлета распрацуюць прыкладна 20 нормаў і правілаў і каля дзясятка кіраўніцтваў па ядзернай і радыяцыйнай бяспецы.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

Блізкая ўлада

# Знайсці работу і вырашыць спрэчкі

**Тэмы працаўладкавання, будаўніцтва камунікацый, шляхі вырашэння зямельных спрэчак абмяркоўваліся на прыёме грамадзян, які правёў старшыня Гомельскага аблвыканкама Генадзь САЛАВЕЙ.**

Пытанне аб працаўладкаванні агучыла маладая жанчына. Па спецыяльнасці яна біёлаг. Да «дэкрэта» падзарабляла, у тым ліку і бухгалтарам. Дзіцяці хутка спаўняецца тры гады, і заяўніца шукае месца работы. Дапамагчы ў сітуацыі даручана галоўнаму ўпраўленню адукацыі аблвыканкама, паведаміла БелТА.


Фота БелТА.

Жыхаркі дамоў па 10-й Навасёлкавай абласнога цэнтра цікавіліся перспектывай будаўніцтва каналізацыі па вуліцы. На ёй крыху больш за 40 дамоў. Абмяркоўваўся варыянт, каб фінансаваць праект на парытэтных умовах: 50 працэнтаў — насельніцтва і 50 % — з бюджэту. «Стварайце кааператыў, фінансаванне са свайго боку гарантуем», — паабяцаў Генадзь Салавей. У найбліжэйшы час з жыхарамі правядуць сход і абмяркуюць усе аспекты.

Арганізаваць праезд да свайго дома прасіла жыхарка Гомельскага раёна. Паводле яе слоў, гэта ўплывае ў тым ліку і на пажарную бяспеку. Жанчына прывяла прыклад: калі было ўзгаранне ў яе лазні, пажарная машына не магла пад'ехаць. У сітуацыі даручана разабрацца райвыканкаму.

Зямельную спрэчку па вызначэнні граніц участкаў доўжыцца не першы год паміж суседзямі ў пасёлку Забяка Гомельскага раёна. Шукаць вырашэнне пытання неабходна ў прававой плоскасці, падкрэсліў старшыня аблвыканкама.

Свая справа

# ДЗЯРЖАВА ДАПАМАГАЕ БЕСПРАЦОЎНЫМ

## распачаць уласны бізнес

**У 2020 годзе служба занятасці выдзеліла 1629 беспрацоўным субсідыі на арганізацыю прадпрымальніцкай і рамеснай дзейнасці, аказанне паслуг у сферы аграэкатурызму — на агульную суму 4,7 млн рублёў, паведамілі на сайце Мінпрацы і сацыяльнай абароны насельніцтва.**

Большасць атрымальнікаў — 1324 беспрацоўныя — выкарысталі гэтыя сродкі для адкрыцця ўласнай справы. 1249 чалавек, якія атрымалі субсідыю, прайшлі яшчэ і навучанне асновам прадпрымальніцтва. Яшчэ 291 чалавек атрымаў матэрыяльны стымул на рамесніцтва. 14 чалавек хацелі пачаць аказваць паслугі ў сферы аграэкатурызму з дапамогай дзяржавы.

Пры гэтым 10 беспрацоўных арганізавала прыватнае унітарнае прадпрыемства, пяць чалавек арганізавала сялянскую (фермерскую) гаспадарку.

Сярод атрымальнікаў субсідый нямала і жанчын — 44,4 %. У прыватнасці 586 беспрацоўных беларусак, дзякуючы дапамозе дзяржавы змаглі арганізаваць прадпрымальніцкую дзейнасць, 131 грамадзянка скарысталася субсідыяй на рамёствы, сем — на арганізацыю паслуг аграэкатурызму.

Арганізацыя самазанятасці аказала падтрымку 16 беспрацоўным ва ўзросце да 21 года, якія ўпершыню шукалі работу, і 49 грамадзянам з абмежаванымі магчымасцямі.

Часцей за ўсё субсідыяй карыстаюцца беспрацоўныя, каб адкрыць бізнес у рознічным гандлі (304 атрымальнікі ў 2020 годзе); аказваць паслугі ў галіне будаўнічых, аддзелачных, электрамантажных, сантэхнічных і іншых рамонтных работ (227 беспрацоўных); аказваць цырульніцкія і касметычныя паслугі (146); для арганізацыі работы грузавога аўтамабільнага транспарту і таксі (107); для абслугоўвання і рамонту аўтамабіляў (60); для вытворчай дзейнасці (54); для сельскагаспадарчай вытворчасці (23); іншых відаў бізнесу (403).

Субсідыя даецца ў памеры 11-кратнай велічыні бюджэту пражытачнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва (БПМ), які дзейнічае на дату заключэння з беспрацоўным дагавора аб аказанні падтрымкі.

Пры арганізацыі прадпрымальніцкай дзейнасці, аказання паслуг у сферы аграэкатурызму, рамеснай дзейнасці беспрацоўнымі, зарэгістраванымі па месцы жыхарства ў малых гарадах і раёнах з высокай напружанасцю на рынку працы, а таксама ў сельскіх населеных пунктах, субсідыя выдзяляецца ў памеры 15-кратнай велічыні БПМ.

Калі ж бізнес звязаны з укараненнем вынікаў навуковых даследаванняў і распрацовак (аб'ектаў правa прамысловай уласнасці: вынаходства, карыснай мадэлі, прамысловага ўзору, сорту расліны, тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы), субсідыя роўная ўжо 20 БПМ.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Паліцыя Капітолія ўзмоцніць меры бяспекі з-за трывожных разведданых



Меры бяспекі вакол Капітолія ЗША ў Вашынгтоне будуць узмоцнены з-за атрыманай паліцыяй інфармацыі і даных разведкі. «Дэпартамент распачаў неадкладныя крокі па ўмацаванні нашай сістэмы бяспекі і ўкамплектаванні штатаў на працягу некалькіх дзён, у тым ліку 4 сакавіка», — адзначаецца ў заяве паліцыі Капітолія. Таксама паведамляецца, што да аховы парадку ў Вашынгтоне прыцягнуць дадатковыя супрацоўнікі паліцыі і Нацгвардыі, а таксама выстаўлены агароджы вакол будынка Кангрэса ЗША. Акрамя таго, у мэтах забеспячэння бяспечнага перамяшчэння кангрэсменаў дадатковыя сілы задзейнічаны ў трох мясцовых аэрапортах і на вакзале. Як вядома, прыхільнікі тэорыі змовы QAnon лічаць, што экс-прэзідэнт Дональд Трамп будзе інаўгураваны 4 сакавіка, паколькі ў гэты дзень праходзілі прэзідэнцкія інаўгурацыі да 1933-га.

### Навукоўцы выявілі здольнасць бразільскага штама пераадольваць імунітэт ад COVID-19



Штам каранавіруса P.1, які ўпершыню быў выяўлены ў Бразіліі, здольны ў значнай меры пераадольваць імунітэт, выпрацаваны ў перахварэлых людзей. Аб гэтым паведаміла Financial Times са спасылкай на сумеснае даследаванне, праведзенае ўніверсітэтамі Оксфарда, Сан-Паўлу і Імперскага каледжа Лондана. З яго вынікае, што са 100 чалавек, якія перахварэлі на каранавірус у першую хвалю пандэміі, ад 25 да 61 могуць паўторна заразіцца P.1. Аўтары даследавання таксама адзначылі, што гэты штам у 1,4—2,2 раза больш заразны, чым іншыя варыянты ковіду. Даследаванне праводзілася ў бразільскім горадзе Манаус, дзе ўпершыню быў выяўлены новы штам, паведаміла The New York Times. Манаус моцна пацярпеў яшчэ ў першую хвалю пандэміі: да кастрычніка на ковід перахварэла прыкладна тры чвэрці жыхароў горада, насельніцтва якога складае два мільёны чалавек. Але атрыманы калектыўны імунітэт не прывёў да чаканага запавольвання распаўсюджвання віруса. У канцы 2020-га і пачатку 2021 года Манаус сутыкнуўся з новым усплёскам захваральнасці.

### Пясчаныя буры ў Сахары павысілі ўзровень радыеактыўнасці ў Еўропе



Рост выпраменьвання зафіксавала Асацыяцыя па кантролі радыеактыўнасці на Захадзе (ACRO), паведаміла Euronews. Спецыялісты прааналізавалі ўзоры пяску, які выпаў на горны масіў Юра каля граніцы паміж Францыяй і Швейцарыяй. Паводле даных экспертаў, вятры сірока разам з пяском даставілі на еўрапейскі кантынент цэзій-137 — прадукт радыеактыўнага распаду, які характэрны для ядзерных выбухаў. Даследчыкі ўпэўнены, што гэта наступствы выпрабаванняў, якія Францыя праводзіла ў Сахары падчас распрацоўкі зброі масавага паражэння. З пачатку зімы Заходняя Еўропа перажыла ўжо тры «пылавыя аблокі» з Сахары. Сірока пераносяць пясок перш за ўсё над тэрыторыямі Іспаніі, Італіі, Францыі, Вялікабрытаніі і Германіі.

Запрашальнік

# ВЯСНА ПРЫХОДЗІЦЬ У «СТАЛІЦУ»

## Прыгожае свята пройдзе ў Мінску 5 сакавіка

**Напярэдадні Міжнароднага жаночага дня Беларускі саюз жанчын і канцэрн «Беллегпрам» правядуць святочнае мерапрыемства «Настрой — Вясна», якое прыме гандлёвы цэнтр «Сталіца» 5 сакавіка.**

Арганізатары абяцаюць насычаную праграму, якая задаволіць інтарэсы кожнай удзельніцы. Зарадзяць усіх святочным настроем будуць вядомыя спевакі і творчыя калектывы Мінска. Хэдлайнеры свята — заслужаныя артысткі Рэспублікі Беларусь Алена Ланская і Ірына Дарафеева.

Сустракаць вясну трэба стыльна і прыгожа, у адпаведнасці з усімі тэндэнцыямі новага сезона. Падчас мерапрыемства адбудзецца модны паказ. Арганізатары абяцаюць, што сэрцы гасцей свята не застануцца раўнадушнымі — іх чакаюць модныя паказы ад удзельнікаў рэспубліканскага конкурсу «Млын моды». Свае калекцыі прадставяць беларускія дызайнеры. Магічным і захапляльным мерапрыемства зробяць выступленні цыркавых артыстаў. А падсілкавацца пасля атрымання яркіх эмоцый можна будзе падчас дэгустацый прысмакаў ад найлепшых беларускіх вытворцаў. Захаваць уражанні ад прыгожага свята і падзяліцца імі ў сацыяльных сетках можна будзе на шматлікіх фотазонах.

Частку вясновага настрою для ўсіх аматараў кнігі падорыць стэнд Выдавецкага дома «Звязда». Бо кніга застаецца найлепшым падарункам — на 8 Сакавіка таксама.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# Будучыя журналісты, шукайце герояў!

## Рэспубліканскі конкурс юных карэспандэнтаў стартуе ў БДУ

**Мерапрыемства прымеркавана да 100-годдзя ўніверсітэта. Да ўдзелу запрашаюцца беларускія школьнікі ва ўзросце ад 8 да 16 гадоў, якія могуць выступаць індывідуальна або калектыўна.**

Конкурс пройдзе ў трох намінацыях: «Публікацыя», «Відэа- і аудыёсюжэт» і «Блог». Прымаюцца работы, прысвечаныя памятным і гістарычным мясцінам Беларусі, жыхарам рэгіёна і іншым актуальным падзеям. Гэта могуць быць матэрыялы рознага жанру: рэпартажы, інтэрв'ю, публіцыстычныя эсэ, аўтарскія перадачы. Удзельнічаць можна адначасова ў трох катэгорыях.

Творчыя работы, кароткую біяграфію і фота ўдзельніка неабходна выслаць да 3 мая на паштовы адрас: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9 з пазнакай «Юны карэспандэнт».

Імёны пераможцаў назавуць 15 мая.

Арганізатарам мерапрыемства выступае факультэт журналістыкі БДУ пры ўдзеле міністэрстваў інфармацыі, адукацыі, грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз журналістаў», рэспубліканскіх і рэгіянальных СМІ.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# Хто сярод найлепшых?

## Зацверджаны пералік высокіх вынікаў для спартыўных камандаў

**Міністэрства спорту і турызму вызначыла пералік спартыўных вынікаў, дасягнутых клубамі па відах спорту ці іншымі арганізацыямі фізічнай культуры і спорту на еўрапейскіх клубных турнірах па гульнявых відах спорту, у Кантынентальнай хакейнай лізе і Маладзёжнай хакейнай лізе, якія будуць лічыцца высокімі. Адпаведная пастанова Мінспорту № 6 ад 19 лютага 2021 года апублікавана на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.**

Высокім дасягненнем у баскетболе будзе лічыцца выхад у 1/8 фіналу Кубка ФІБА Еўропы і Еўракубка, 1/4 фіналу чэмпіянату Адзінай лігі ВТБ, а таксама выхад у групавы турнір Лігі чэмпіёнаў. У бейсболе добры вынік — 1—8 месца Кубка Еўропы. У водным пола — выхад у 1/8 фіналу Лігі чэмпіёнаў, у 1/4 фіналу Еўракубка для мужчын і Трафея еўрапейскай федэрацыі плавання для жанчын. Для валейбалістаў добрым вынікам стане выхад у 1/8 фіналу Лігі чэмпіёнаў, Кубка выкліку, а таксама Кубка Еўрапейскай канфедэрацыі валейбола. У гандболе высокім вынікам будзе лічыцца выступленне ў 1/4 фіналу Лігі Еўропы, а таксама выхад у групавы турнір Лігі чэмпіёнаў. Футбалістам трэба выйсці ў групавыя турніры Лігі чэмпіёнаў і Лігі Еўропы для мужчын, жанчыны павінны прабіцца ў 1/8 фіналу Лігі чэмпіёнаў. У міні-футболе добрым вынікам стане выхад у элітны раўнд Лігі чэмпіёнаў.

У хакеі з шайбай да высокага дасягнення будзе адносіцца выхад у 1/8 фіналу Лігі чэмпіёнаў, Кантынентальнай хакейнай лігі ці Маладзёжнай хакейнай лігі, першае ці другое месца ў Кантынентальным кубку. Для хакея на траве дастаткова выйсці ў групавы турнір Еўралігі і заняць першае ці другое месца міжнароднага турніру «Трофі».

Пастанова ўступіла ў сілу пасля афіцыйнага апублікавання.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# СКАРБНІЦА ДЗІКАЙ ПРЫРОДЫ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Прыродаахоўныя лясы займаюць каля 1,6 млн га, ці 16 % тэрыторыі ляснога фонду. Асноўную іх частку складаюць асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі. Каб каштоўныя тэрыторыі захоўваліся найбольш эфектыўна, выяўляюцца і перадаюцца пад ахову землекарыстальнікам тыповыя і рэдкія біятопы, асобныя ўчасткі лесу ў іх натуральным стане. З 2015 года выяўлена і перададзена пад ахову больш за 250 біятопаў агульнай плошчай каля 27 тысяч гектараў.

Лясы іграюць вялікую ролю ў захаванні воднага балансу, дапамагаюць змяншаць выпарэнне вільгаці і зніжаць паверхневы сцёк. Акрамя таго, лясныя экасістэмы рэгулююць тэмпературны рэжым на планеце, з'яўляючыся галоўным паглынальнікам аднаго з парніковых газаў — вуглякіслага. Так, штогод лясы краіны паглынаюць больш за 35 млн тон $CO_2$.



**«З сакавіка 1973 года была падпісана Канвенцыя аб міжнародным гандлі відамі дзікай фаўны і флоры, якія знаходзяцца пад пагрозай знікнення (СІТЭС). У 2013 годзе Генеральная асамблея ААН абрала гэты вясновы дзень Сусветным днём дзікай прыроды».**

— Мінлясгас распрацаваў і зацвердзіў шэраг дакументаў, накіраваных на зніжэнне наступстваў ад змены клімату ў галіне ляснай гаспадаркі, — адзначыў прадстаўнік міністэрства. — Мерапрыемствы, запланаваныя ў дакументах, дазволяць павялічыць плошчу лясоў і лясістасць краіны да 42 %, палепшыць пародную і ўзроставую структуру лясоў, павялічыць прадукцыйнасць насаджэнняў.

## Смарагдавая сетка ў Беларусі

Лясы застаюцца галоўным асяроддзем пражывання для трох чвэрцяў усіх відаў жывёл, раслін і грыбоў, расказаў **кансультант аддзела біяразнастайнасці Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віталь КАРАНЧУК.** І каб захаваць прадстаўнікоў флоры і фаўны, неабходна зберагчы іх тэрыторыі пражывання. Таму прыярытэтам беларускай прыродаахоўнай палітыкі з'яўляецца захаванне прыродных комплексаў і экалагічных сістэм, у тым ліку лясных.

Каштоўныя прыродныя тэрыторыі Беларусі звязаны з аналагічнымі еўрапейскімі аб'ектамі праз так званую Смарагдавую сетку прыродаахоўных тэрыторый, куды ўваходзяць 155 беларускіх тэрыторый агульнай плошчай 2,3 млн га, ці 11 % ад плошчы краіны. Туды ўключаны і асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі (ААПТ).

— Агульная плошча ААПТ сёння складае 1,8 млн га, ці 9 % ад агульнай плошчы краіны, — адзначыў Віталь Каранчук. — За апошнія тры гады яна павялічылася на 67,5 тыс. га — гэта больш, чым тэрыторыя Нацыянальнага парку «Браслаўскія азёры».

У склад Смарагдавай сеткі ўваходзяць таксама прыродныя тэрыторыі, якія падлягаюць спецыяльнай ахове — гэта месцы пражывання чырванакніжнікаў, каштоўныя і рэдкія біятопы. Сёння ў Беларусі зарэгістраваны 1758 месцаў пражывання дзікіх жывёл і 2265 месцаў росту дзікарослых раслін, 622 біятопы.

Неабходна таксама выяўляць з дапамогай вучоных і іншыя тэрыторыі, якія адпавядаюць крытэрыям Смарагдавай сеткі. Дзякуючы гэтаму яна зможа вырасці ў нашай краіне да 13—15 %.

## Праблемы, якія трэба вырашаць

Сёння ў свеце захавалася прыблізна палова тых лясоў, якія існавалі да інтэнсіўнага развіцця чалавецтва, ці 4,06 млрд га. І лясы Беларусі складаюць усяго 0,27 % ад лясоў свету. Але нават гэтую невялікую ў параўнанні з іншымі краінамі долю неабходна захоўваць і прымнажаць — упэўнены **дырэктар Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча НАН Беларусі, кандыдат біялагічных навук Аляксандр ПУГАЧЭЎСКІ.** Лясная гаспадарка і лесанарыхтоўка даюць 2,7 % ВУП Беларусі. Наша краіна цалкам забяспечвае сябе драўнінай, за выключэннем драўніны трапічных парод.

Па словах Аляксандра Пугачэўскага, дзякуючы ў тым ліку стварэнню ААПТ прыкладна ў пяць разоў вырасла доля спелых і перастойных лясоў, адначасова ідзе паляпшэнне іх узроставай структуры. Але нягледзячы на работу, якую праводзяць прадстаўнікі розных ведамстваў і навуковых арганізацый па захаванні і прымнажэнні лясных тэрыторый, сёння існуе шмат праблем, якія патрабуюць свайго вырашэння.

### • Змяняецца клімат — пакутуе лес

Прыродныя бедствы, выкліканыя ў тым ліку працэсамі змены клімату, значна ўплываюць сёння на стан лясных насаджэнняў. Так, у выніку ўспышкі масавага размнажэння караедаў у 2018 годзе быў пастаўлены гістарычны антырэкорд — страчаны 50 000 га лесу.

Змена клімату таксама правакуе павелічэнне колькасці лясных пажараў. Але ўсё ж галоўная прычына іх узнікнення — гэта бяздумныя паводзіны людзей. З чалавечым фактарам звязаны 84 % усіх узгаранняў у лесе. З астатніх 16 % па значнай частцы выпадкаў не атрымліваецца знайсці прычыну.

Штогод шкода ад лясных пажараў складае ад 0,5 да 9,5 мільёна долараў. Пры гэтым, дзякуючы дзейнасці спецыялістаў, каля 83 % узгаранняў у лясным фондзе выяўляюцца на працягу адной гадзіны.

### • Купляеце чарамшу — падтрымліваеце браканьераў

Гэты чырванакніжны від раслін, што расце ў лясах, увесну актыўна прадаецца на стыхійных рынках. Ці проста спыніць знішчэнне віду? Па словах Віталя Каранчука, у лясных масівах праводзяцца рэйды як інспектарамі тэрытарыяльных органаў Мінпрыроды, так і сумесна з прадстаўнікамі Дзяржінспекцыі жывёльнага і раслiннага свету. Але працаваць неабходна і ў гандлёвых пунктах — тут павінны падключацца прадстаўнікі МАРГ, мясцовыя органы ўлады.

**«Сёлета тэма Сусветнага дня дзікай прыроды — «Лясы і сродкі да існавання: забяспечыць людзей і захаваць планету».**

— Мы дзейнічаем у розных кірунках, — кажа Віталь Каранчук. — Звяртаемся да насельніцтва з заклікам не купляць чарамшу, а вырошчваць яе на прысядзібных участках, тлумачым: купляючы мядзведжую цыбулю, вы падтрымліваеце браканьерства. Магчыма, калі знікне попыт на гэтую расліну, спыніцца і незаконная нарыхтоўка чырванакніжніка.

### • У лясных рэсурсаў вялікі кошт

У лясах захоўваюцца значныя рэсурсы раслiннага свету — лекавыя, харчовыя (ягады, грыбы, духмяныя травы), тэхнічныя расліны, эксплуатацыйны запас якіх ацэньваецца ў 497,8 тысячы тон. Усё гэта можна выкарыстоўваць не толькі ўнутры краіны, але і прадаваць за мяжу.

Па словах Аляксандра Пугачэўскага, калі кошт стваловай драўніны ў Беларусі складае 5,4 млрд долараў ЗША, то кошт усіх лясных рэсурсаў — лекавых, харчовых, кармавых раслін, футра і мяса жывёл, ляснога мёду, бярозавага соку і іншых — 12,2 млрд долараў.

Але гэтыя каштоўныя рэсурсы сёння выкарыстоўваюцца далёка не поўнасцю. Як зрабіць беларускія грыбы і ягады, лекавыя расліны канкурэнтаздольнымі на знешнім рынку? Гэта пытанне патрабуе адказу.

**Вераніка КОЛАСАВА.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

---

Жыллёвыя ноу-хау

# ДОМ-КАНСТРУКТАР З ЗАВОДСКІХ КАМПЛЕКТАЎ

## Там у кватэрах за камфортам «сочыць» аўтаматыка, якой можна кіраваць на адлегласці

**У жыллёвым комплексе «Зялёная гавань», што пад Мінскам, пабудуюць першы шматкватэрны дом з гатовых камплектаў апошняга пакалення. Усе элементы будуць выраблены на заводзе жалезабетонных канструкцый «СБК», а затым сабраныя разам па прынцыпе канструктара. Праект унікальны: планіроўкі і многія рашэнні былі адаптаваны пад індывідуальныя патрабаванні забудоўшчыка.**

Новы сіціхаус будзе ўключаць тры пад'езды рознай вышыні — ад трох да пяці паверхаў, і стане першым домам, цалкам сабраным з жалезабетонных канструкцый уласнай вытворчасці. Першы паверх зоймуць кватэры з адкрытымі тэрасамі. Дах дома будзе эксплуатавацца, каб жыхары маглі збірацца летнімі вечарамі і бавіць час з суседзямі.

«У гэтага дома няма аналагаў — магчымасці завода дазваляюць нам увасабляць нестандартныя ідэі і ўзводзіць сучасныя будынкі еўрапейскага класа. Сіціхаус у «Зялёнай гавані» быў распрацаваны менш чым за год. Ён вызначаецца як сваёй архітэктурай, фасаднымі рашэннямі, так і новымі планіроўкамі. Камплекты будуць выраблены на заводзе, дастаўлены на будоўлю і сабраны ў гатовы дом. Такім спосабам мы можам узводзіць дамы ў кароткія тэрміны, а пры праектаванні распрацоўваць канфігурацыю дома і планіровачныя рашэнні пад індывідуальныя задачы заказчыка, што не рэалізуюць іншыя гульцы рынку», — адзначаюць на заводзе «Сучасныя бетонныя канструкцыі» (СБК).

Планіровачныя рашэнні ў доме адпавядаюць сучасным запытам і актуальным тэндэнцыям на рынку нерухомасці. Кватэры даступныя як без адздройвання, так і з гатовым інтэр'ерам. На выбар — скандынаўскі хюге або еўрапейскі мінімалізм. У адстройванне таксама ўваходзіць сістэма «Разумны дом» — набор элементаў, якія аўтаматычна кантралююць розныя працэсы ў кватэры і дазваляюць кіраваць імі аддалена.

Сіціхаусы — гэта дамы вышынёй ад чатырох да сямі паверхаў, якія створаны для тых, хто даўно марыць пра жыццё на прыродзе, але не гатовы адмовіцца ад гарадскога фармату.

**Сяргей КУРКАЧ.**



# КУДЫ ЗНІКЛІ ДЗЯДУЛІ?

Гартаючы стужку адной вядомай сацсеткі, чапляюся за пост віртуальнага сябра. Некалькі разоў перачытваю спадара Сяргея: «Мы многае разгубілі. У каталозе страт — самыя нечаканыя рэчы. Кудысьці зніклі дзядулі. Дзядуля — гэта не проста муж бабулі. Гэта добры чалавек з разумнымі вачыма, з сівой барадой і напрацаванымі рукамі. У тую далікатную пару жыцця, калі вы пазнаяце свет, дзядуля павінен садзіць вас на калені і расказваць аб далёкіх зорках і вялікіх героях. Такія дзядулі кудысьці зніклі. Прычым бабулі засталіся. Яны нават адчулі сябе гаспадынямі становішча. Няма каму на іх прыкрыкнуць. Няма каму паставіць іх на месца. Бабулі зашпільваюць вам гузікі і кормяць вас маннай кашай. А хіба можа вырасці з чалавека нешта слушнае, калі ў дзяцінстве ён не чуе аб зорках і вялікіх людзях?»

Мне пашанцавала: у мяне былі два дзядулі. Абодвух я памятаю. Дзядуля Валодзя, бацька мамы, усё жыццё адпрацаваў на чыгунцы. Таму не дзіва, што ён шмат расказваў нам пра паравозы і электрычкі, чыгуначныя пуці, адметныя станцыі, дзе сам пабываў. Я памятаю, як ён павольна рухаўся па сваёй гарадской кватэры, браў з паліцы кнігу з прыгожай вокладкай, садзіўся ў сваё ўлюбёнае мяккае крэсла — і мы, яго чацвёра ўнукаў, затойвалі дыханне ў чаканні чарговай казкі. Пакуль бабуля завіхалася на кухні, дзядуля Валодзя даставаў са сваіх тайнікоў цукеркі і частаваў нас. А яшчэ ён вадзіў нас на карусэлі — для мяне, вясковай дзяўчынкі, гэта была вялікая падзея! Браў нас з сабой на базар, дзе абавязкова нешта набываў, частаваў марожаным у кафэ. Ён памёр, калі мне было ўсяго дзевяць гадоў. Зусім трохі не хапіла, каб дзед расказаў мне і пра вялікіх людзей, і пра далёкія зоркі...

Другі дзядуля, па бацькавай лініі, быў зусім іншы, амаль поўная процілегласць дзядулю Валодзю. Заўжды рухавы, у працы з ранку да вечара — яму не было калі чытаць унукам казкі ды вадзіць іх на шпацыры. Вялікая гаспадарка, праца ў полі, на прысядзібным участку — жыццё ў вёсцы патрабавала шмат клопату. Праўда, на сваіх нашчадкаў ніколі не забываўся. У дзядулі Івана быў уласны метад выхавання: да таго, што рабіў сам, далучаў і нас. Асабліва шанцавала старэйшым, хлопцам. Разам з дзедам яны касілі сена і зграбалі яго ў стагі, пілавалі і насілі ў паветку дровы, адзявалі спецыяльнае абмундзіраванне і даставалі з вулляў мёд, збіралі вінаград, а пасля ціснулі з яго віно... Нас жа, дзяўчат, дзед браў з сабой у лес, у поле, на возера, часта мы пасвілі з ім кароў. Самае цікавае, што нас ніхто не прымушаў. Проста з дзядулем было так цікава, што мы навыперадкі «напрошваліся» да яго ў памагатыя. А рабіць тое ж, што і ён, старэйшы ў нашым родзе, азначала, што мы станавіліся дарослымі, чаго нам вельмі хацелася. Толькі цяпер разумееш, што гэта былі сапраўдныя ўрокі чалавечнасці. І зусім не абавязкова было гаварыць з намі пра вялікіх людзей і далёкія зоркі...

Пашанцавала з дзедам і майму сыну. На жаль, аднаго дзеда ён ніколі не бачыў: бацька мужа заўчасна пайшоў з жыцця. Але ўпэўнена, што дзядуля Алег мог бы шмат чаго расказаць Цёміку, шмат чаму навучыць (дзякуючы бацькавай навуцы ў майго мужа «залатыя» рукі). За дваіх гэтую пачэсную ролю выконвае мой бацька — дзядуля Іванавіч, як называе яго Арцём. Сказаць, што ён для малога аўтарытэт — не сказаць нічога. Гэтыя амаль тры гады, што я знаходжуся ў дэкрэтным адпачынку, бацька выхоўвае майго сына нароўні са мной. Ён гуляе з ім на вуліцы і дома, чытае яму казкі, калі я адлучаюся з дому, кладзе малога спаць. Яны разам ядуць, збіраюць ягады, выбіраюць на агародзе моркву і буракі, чысцяць снег, выбіваюць дыванкі, лушчаць фасолю... Менавіта дзякуючы дзеду маё амаль трохгадовае дзіця ведае больш як дзясятак чатырохрадкоўяў, ды такіх, што і я чула іх упершыню! Дзед навучыў Цёміка рамантаваць свае цацачныя трактары, чысціць перад выхадам на вуліцу боты і абавязкова складваць пасля гульні цацкі. Я ўпэўнена, што праз некалькі гадоў, калі ўнук падрасце, дзед Іван абавязкова раскажа яму і аб далёкіх зорках, і аб вялікіх людзях.

Дык куды ж зніклі дзядулі? У нас, дзякуй богу, нікуды не знікалі. Камусьці пашчасціла менш. Сапраўды, у асноўным бабулі забіраюць сваіх унукаў з дзіцячых садкоў, вядуць іх у першы клас, а потым выпраўляюць у войска. На дзіцячых пляцоўках з малымі — бабулі, яны ж і ў аўтобусах, у чарзе да педыятра, за дзвярыма музычных школ і спартыўных секцый. А дзядулі, у лепшым выпадку, кіруюць прадпрыемствамі ці пасля рабочай змены хутчэй спяшаюцца адпачыць на канапе, шукаючы па тэлебачанні патрэбную праграму ці цікавы дэтэктыў. Яны заняты лецішчам, рамонтам, рыбалкай, гульнёй у карты, і ім нават у галаву не прыходзіць, што побач расце той, каму як паветра патрэбна пачуць і пра вялікіх людзей, і пра далёкія зоркі...

**Вераніка КАНЮТА.**


Сямейная газета

Выпуск № 4 (163)


Зрабі сябе сама!

# ПРАФЕСІЙНА І НЕ ПАД КАПІРКУ



**Яна ўпэўнена сябе адчувае і ў нацыянальным строі, калі робіць цеста для вясельнага каравая, і ў блакітным футры Снягуркі, калі праводзіць ранішнік для дзетак, і ў шыкоўнай сукенцы пэўнай эпохі, калі выконвае аўтэнтычныя беларускія спевы пад гукі старажытных музычных інструментаў. Арганізацыяй розных імпрэз, прафесійна ды не пад капірку, як яна сама гаворыць, Дзіяна КРАСНАШАПКА займаецца не першы год. Гэтаму папярэднічаў вялікі жыццёвы этап, які, вядома ж, звязаны з творчасцю. Мы вырашылі сустрэцца з Дзіянай і пагаварыць падрабязней пра шлях у прафесію, а таксама даведацца, як выглядае працэс падрыхтоўкі свята, што для гэтага насамрэч неабходна і чаму яе аўтарскія праграмы такія запатрабаваныя.**


*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*


Вакол нас

# Быць у руху

## Тэатр без межаў, комплексаў і страхаў



**Чуваць дзіўнае бульканне і рык. Я нясмела адчыняю дзверы, і на мяне ўтаропліваюцца з дзясятак пар вачэй дзяцей, якія відавочна прыкідваюцца... грызунамі.**

— А цяпер вы раз'юшаныя хамякі! Гучней, Рома, гучней! Ну хіба такі гук выдае ашалелы хамяк?! — углядаючыся ў твары «грызуноў», выдае **актрыса, музыкант і валанцёр выкладчык студыі «Тэатр без межаў» Кетэван АСТРАШВІЛІ.**

Дзеці адказваюць азвярэлым шыпеннем. Раптам каля мяне з'яўляецца **«Місіс Беларусь — 2018» Кацярына САКОВІЧ.** Яна натхняльніца і кіраўнік гэтай незвычайнай студыі для дзяцей з замяшчальных сем'яў. Мы прабіраемся праз вясёлыя крыкі і выццё тынэйджараў у суседні пакой, каб пагаварыць у цішыні.

Сама Кацярына на сцэне з дзяцінства: ездзіла на конкурсы, фестывалі, канцэрты... Калі будучая місіс Беларусь вучылася ў ліцэі БДУ, аднойчы з тэатральнай групай паехала выступіць у дзіцячы анкацэнтр. Як прызналася жанчына, гэта для яе было сапраўдным выпрабаваннем. Яна прывыкла адкрыта глядзець на гледача, а тут — дзеці, з кропельніцамі, у якіх ад хіміятэрапіі выпалі валасы... Тады Каця ўпершыню задумалася сур'ёзна аб тым, што з людзьмі часам адбываецца нешта дрэннае не па іх волі.

— У той дзень я ўсвядоміла, што хачу дапамагаць дзецям, — расказвае Кацярына пра ўзнікненне студыі «Тэатр без межаў». — Крута дапамагаць і жывёлам, і пажылым... Але маё сэрца ў той момант назаўсёды атрымалі дзеці. Падчас падрыхтоўкі да конкурсу «Місіс Беларусь» адным з этапаў быў сацыяльны праект. Нягледзячы на тое што я па адукацыі журналіст, тэатр адчувала вельмі тонка. Тое разняволенне, якое дае сцэна, упэўненасць у сабе і адкрытасць. Мне хацелася гэтаму навучыць дзяцей.


*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Нічога лішняга

# АДЧУЙ СЯБЕ СВАБОДНАЙ

**Віцебскія дызайнеры стварылі калекцыю хустак, якія можна атрымаць, зрабіўшы... фота без макіяжу**

**Члены грамадскага аб'яднання «Беларуская палата моды» Марына Давыдава, Таццяна Яфрэмава і Наталля Балашэўская стварылі хусткі з аўтарскім прынтам, якія можна атрымаць праз сацыяльныя сеткі.**

Віцебская мастацкая традыцыя стала шырока вядомай ва ўсім свеце дзякуючы Марку Шагалу, яго карцінам з глыбокімі сэнсамі і таемнымі знакамі. Менавіта гэта спадчына злучылася з карпаратыўнай філасофіяй брэнда Dove ў праекце «#покажитенас» — жанчына прыгожая апрыёры.

Стандарты прыгажосці? Эталонныя асобы? Іконы і секс-сімвалы? Не, гэта стэрэатыпы, якім не месца ў XXI стагоддзі! Кожная жанчына ўнікальная і прыгожая. Кожная і эталон, і прыклад для пераймання, і ідэал. Кожнай жанчыне ёсць што сказаць і паказаць. Яна валодае сілай волі, любові і тварэння, а як следства — непаўторнай прыгажосцю, якая не мае межаў.

На жаль, у медыйнай прасторы ўсё яшчэ тыражуюцца крытэрыі «прыгожа» і «непрыгожа». Але мы жывём у важны час, калі самавыяўленне, гендарная роўнасць, узаемная павага людзей у грамадстве маюць вялікае значэнне і каштоўнасць. Таму дызайнеры натхніліся сімвалам свабоды — голубам. Вынікам сумеснай працы стала лімітаваная лінейка шыйных хустак і хустак-карэ з экашоўку трох розных дызайнаў.



«Сінія галубы, размешчаныя на хустцы, працягваюць ідэю кампаніі Dove: маніфест любові і свабоды жанчыны. Мэтай пры стварэнні прынтаў для хусткі было дапамагчы жанчынам зноў адчуць сябе прыгожымі і бестурботнымі. А кветкавы прынт, як ніколі, актуальны менавіта вясной», — гаворыць **дызайнер Наталля БАЛАШЭЎСКАЯ на сайце Беларускай палаты моды**.

«Хустка ў гардэробе іграе важную ролю незалежна ад таго, як яе выкарыстоўваць, — тлумачыць **кіраўнік Belarus Fashion Week, старшыня Беларускай палаты моды Яніна ГАНЧАРОВА**. — Яна быццам бы фіналізуе вобраз і задае яму настрой. Калі гэта шыйная хустка, то падыходзіць да дзелавых вобразаў, добра спалучаецца з касцюмамі і кашулямі. Рамантычныя асобы ўплятаюць іх у валасы або падвязваюць на сумку. Хустка — ідэальны аксесуар, каб закруціць яго на каўнер паліто ці накінуць на плечы. Розныя спосабы нашэння — розныя ролі сучаснай жанчыны».

Праект ініцыяваны старшынёй Беларускай палаты моды. Творчых лэдзі падтрымаў вядомы брэнд Dove. Матэрыялізаваць дызайн дапамагла кампанія Elletto — модны брэнд з Брэста, які ўзяў на сябе вытворчы бок праекта. Больш за сто вырабаў плануецца раздаць праз сацыяльныя сеткі. Для гэтага трэба зрабіць фота без макіяжу, выкласці ў сваім інста-акаўнце і адзначыць тэгам #покажитенас, а таксама выслаць у дырэкт @modalive.by. Пры гэтым абавязкова быць падпісантам @belarusfashionweek і @belarusfashioncouncil.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

# «ВЫБУХ» У ЯГО ГАЛАВЕ,

## або Як не нашкодзіць выхаваннем?

**Вы не задумваліся, што быць бацькамі — гэта адна з самых складаных... прафесій? А яшчэ гэта творчасць. Сваімі паводзінамі мы не толькі ўплываем на характар дзіцяці, а нават можам праграмаваць яго лёс.**



Калі, напрыклад, перастарацца з кантролем, можна вырасціць чалавека, няўпэўненага ў сабе, няздольнага прымаць самастойныя рашэнні і наладжваць узаемаадносіны з іншымі, абыякавага альбо наадварот раздражнёнага, ці такога, што гатовы ісці па галовах, маніпуляваць, падпарадкоўваць іншых. Калі вы заўважаеце за сабой назойлівае жаданне кантраляваць кожны крок дзіцяці — гэта папярэджанне, што трэба нешта мяняць.

### Скажыце «стоп»!

Сузалежныя адносіны вельмі цяжка распазнаць. Але калі вы адчулі, што дзіця — гэта самастойная асоба, а не працяг вас, не інструмент для рэалізацыі ўласных амбіцый, каб зарабіць плюсікі ў карму (бо «я ж добрая маці», «я столькі для яго раблю»), значыць, сітуацыя не такая безнадзейная.

Як часта, калі вы дзеліцеся сямейнымі навінамі, ужываеце займеннік «мы»? Мы хварэем. Мы навучыліся хадзіць. Мы пайшлі ў школу. Адна справа, што вы так успрымаеце сваю сямейную ролю, калі сын маленькі — сапраўды, вы ўкладаеце столькі намаганняў, каб раскрыць для яго гэты свет, многаму навучыць. Але калі нашчадку ўжо 15—17 гадоў, а мама выдае: «Мы не ведаем, куды паступаць», хочацца пашкадаваць абаіх. Так, ад сузалежнасці цярпяць і дзіця, якое, відаць, так і не атрымала права на выбар, і мама, якой пастаянна даводзіцца навальваць на сябе лішнія абавязкі і клопаты.

Змяшанне пачуццяў сваіх і дзіцяці, неўменне задавольваць свае патрэбы без сувязі з малым, а часам і перакідванне на дзіця віны за ўласныя праблемы — вось якое яно, пакаранне за клопат. Часам гэта прыводзіць да таго, што ў такой сям'і дзіця будзе баяцца здзейсніць памылку і аказацца нелюбімым. Гэтак жа занадта «ўважлівая» мама можа хваляваць: а раптам «дзіця» не ацэніць усіх яе намаганняў, палічыць яе непатрэбнай? Ціск можа параджаць толькі крыўды, страх, гнеў, віну, і нават адчай ці апатыю.

У сузалежных адносінах бацькі часта не разумеюць, дзе мяжа паміж абаронай і назойлівасцю, нармальным клопатам і гіперапекай. Калі маці ўсё вырашае за дзіця, яно расце асцярожным, не ўмее давяраць іншым, паважаць чужы выбар, не ведае, якое рашэнне прымаць, куды рухацца.

Кантроль — самы галоўны трывожны званок. Бацькі не давяраюць дзіцяці. Вырашаюць, з кім яму сябраваць, што чытаць, дзе гуляць, чым займацца. Маўляў, мы лепш ведаем, што яму будзе карысна. Здавалася б, бацькі хваляюцца за лёс дзіцяці, каб ён не склаўся па негатыўным сцэнарыі. Але ў той жа час самі становяцца вінаватымі ў будучых няўдачах сваіх сыноў і дачок. Чаго здолее дасягнуць чалавек, якога пазбавілі вельмі неабходных навыкаў, якому не дазвалялі прымаць рашэнні, аналізаваць, выбіраць, ствараць, эксперыментаваць, спрабаваць сябе ў розных сферах, у рэшце рэшт, разумець, што падабаецца і на што ён здольны. А пасля мы дзівімся, чаму некаторыя падлеткі не ўмеюць адчуваць і выказваць свае эмоцыі. Альбо чаму «шаўковае» дзіця ў нейкі момант становіцца некіруемым. Адкуль такі выбух у яго галаве?

Сузалежныя бацькі ніколі не слухаюць дзяцей. Нават калі ў малога ёсць што сказаць, дарослыя не будуць змяняць сваіх рашэнняў. А словы дзіцяці альбо праігнаруюць, альбо пераб'юць сваімі аргументамі.

Часам у дзіцяці бацькі могуць бачыць сябе. Так, калі маці лічыць сябе няўдачніцай, нелюбімай, міжволі імкнецца «прачытаць» гэта ў сваім дзіцяці. А пасля можа яшчэ і «навесіць» на малое такі цэтлік. Хоць юны чалавечак можа проста па-іншаму ўспрымаць свет, у яго не тыя здольнасці і тэмперамент. Многія бацькі хочуць, каб дзіця дасягнула тых вышынь, да якіх яны самі не змаглі дацягнуцца. А часам яшчэ і караюць, калі ў дзіцяці нешта не атрымліваецца ў справах, якія самі дарослыя для іх жа і абралі.

Тут выхаванне ўжо больш нагадвае дрэсіроўку. Прычым дарослыя спрабуюць кіраваць малымі не толькі з дапамогай крыткі, але і пахвальбы. Але гэта ўсё — псіхалагічны шантаж. Дзіця баіцца, што калі яно не будзе адпавядаць усім патрабаванням, яго перастануць любіць.

А можа, уся гэта муштра толькі для таго і патрэбна, каб добра выглядаць у вачах іншых людзей? Мама разварочвае бурную дзейнасць нават не столькі для дзіцяці, а каб паспаборнічаць з іншымі — маўляў, глядзіце, як я яго змагла вывучыць, выхаваць, выдрэсіраваць...

Яшчэ адна з прыкмет, што ў вас не атрымліваецца наладжваць зносіны з дзіцем — непаслядоўнасць. Сёння вы ўсё забараняеце і сварыцеся на малога, а заўтра думаеце, што перагнулі — і становіцеся мяккімі, спагадлівымі, засыпаеце дзіця падарункамі і пацалункамі. Але нават калі вы не мелі рацыі, не прызнаяце сваёй віны. Дзіця трэба вучыць аналізаваць і свае паводзіны, і ўчынкі іншых. Нічога страшнага не будзе ў тым, калі яно зразумее, што мама таксама магла памыліцца. І наогул ад шчырых размоў і дзіця, і маці становяцца толькі мацнейшыя.

### Перапішыце сцэнарый

А цяпер давайце вернемся ў сваё дзяцінства і паспрабуем зразумець, ці не паўтараеце вы зараз сцэнарый, які вам у свой час прапанавалі вашы бацькі.

Вы адчувалі сябе пакінутым дзіцем? Ад адзіноты і непрынятасці вы збягалі ва ўласны свет ілюзій і мар? І добра, калі вам удалося вырасці і пераламаць сябе, пазбавіцца ад бяссілля і няўпэўненасці.

А можа, вы раслі ў пастаянным напружанні, і каб зняць яго, спрабавалі на сабе ролю сямейнага коміка. Раздражненне, крыўду хавалі за гумарам. Здавалася б, такія дзеці лёгка наладжваюць зносіны з іншымі, яны могуць многага дабіцца ў жыцці, але за жартамі яны часта хаваюць свой боль і не ўмеюць радавацца ўласным поспехам.

А можа, вам у дзяцінстве ўдалося вырвацца ў лідары. Вы апраўдвалі ўсе пажаданні бацькоў — былі сярод медалістаў, дасягнулі перамог у спорце, клапаціліся пра малодшых братоў і сястрычак. Але калі лідар — прадукт бацькоўскіх амбіцый, ці атрымліваў ён асалоду ад сваіх поспехаў? Калі такія дзеці вырастаюць, яны падаюцца паспяховымі, але ім па-ранейшаму даводзіцца падаўляць у сабе ўнутраны страх, што нешта може не атрымацца, яны пакутуюць ад нізкай самаацэнкі і няўпэўненасці ў сабе.

А можа, у дзяцінстве вы не захацелі спраўджваць надзеі ці прымаць правілы, якія навязваюць бацькі, былі бунтаром, прыносілі шмат клопатаў і праблем? Такім чынам вы заслугоўвалі сваю порцыю ўвагі. Вы нават верылі, што сапраўды дрэнныя, і таму шукалі такіх жа сяброў. Добра, калі вам удалося выкараскацца. Бо калі такія дзеці не атрымліваюць своечасовай падтрымкі, яны могуць выбраць сапраўды цьмяны шлях — кінуць школу, не атрымаць прафесію, мець праблемы з уладай.

Але што вам перашкаджае перапісаць сцэнарый і ўжо са сваімі дзецьмі стварыць новую шчаслівую гісторыю?

### Што рабіць далей?

Проста любіць дзіця! Не за выдатныя адзнакі ў школе, не за дыпломы на інтэлектуальных і творчых конкурсах, не за медалі на спартыўных спаборніцтвах. (Так, не трэба блытаць любоў з гонарам за дасягненні.) Радавацца, што вы ёсць адзін у аднаго.

На «непаспяховае» дзіця і так можа сыпацца шмат негатыву ў школе ці ў калектыве равеснікаў, але яму вельмі важна адчуваць, што сям'я — гэта тое месца, дзе яно можа атрымаць цеплыню і абарону. І не варта бацькам баяцца праяўляць свае пачуцці — патрэбы ў ласкавых словах і сямейных «абдымашках» у падлеткаў не меншыя, чым у маленькіх дзяцей.

Давяраць. Паважаць. Прымаць такім, якое ёсць. Вы прызнаяце выбар падлеткам заняткаў, сяброў, ідэй. І ў той жа час вучыце, каб ён паважаў тое, чым займаецеся вы.

Межы могуць быць ва ўсіх. У дзіцяці ёсць уласны пакой, рэчы, за якія яно адказвае. Вы нават стукаеце, перш чым зайсці на яго тэрыторыю. Але тады няхай і яно не ўрываецца ў ваш пакой, не патрабуе грошай на свае патрэбы, не завальвае вас сваімі праблемамі, з якімі выдатна можна было б разабрацца самастойна.

Падзяляйце сямейныя абавязкі. Натуральна, памыць посуд ці папрасаваць бялізну ў мамы можа атрымацца лепш і хутчэй, чым у дзяцей. Але выхаванне працай — вельмі важная частка ў станаўленні асобы. Выконваючы хатнія абавязкі, дзеці становяцца больш упэўненыя ў сваіх сілах, да таго ж гэта дае ім адчуванне сваёй важнасці і неабходнасці ў сям'і. Так яны лепш даведаюцца, што ім падабаецца, якія справы лепш атрымліваюцца, што неабходна для самаідэнтыфікацыі і нават выбару будучай прафесіі. І не трэба забывацца пра перспектыву — калі з двух гадоў дзіця здольнае прыбраць за сабой цацкі, у школьным узросце — пакой і посуд, схадзіць у краму, то да 15 гадоў яно ўжо павінна ўмець рабіць практычна ўсё, што даецца даросламу чалавеку. Менавіта такія дочкі і сыны адаптаваныя да самастойнага жыцця. І яшчэ адзін важны бонус — у іх ёсць шчаслівая, а не загнаная, змораная хатнімі справамі мама. А колькі вызваляецца часу на сумесны сямейны адпачынак! Паходы на прыроду, гульні, падарожжы не менш важныя за засваенне ведаў, бо якая карысць ад разнастайных дасягненняў, калі чалавек не ўмее радавацца простым рэчам і не адчувае сябе шчаслівым?

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

# Быць у руху

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

**— З якімі цяжкасцямі вы сутыкнуліся ў сваім жаданні адкрыць студыю для дзяцей-сірот? Для яе ж патрэбна памяшканне, выкладчыкі, вучні, якім гэта цікава...**

— Гэта былі сапраўдныя прыгоды. Памятаю, тэлефанавала ў школы-інтэрнаты і дзіцячыя дамы, а ў мяне здзіўлена пыталіся: «Вы ўвогуле хто?»

І калі ў мяне з'явіўся тытул «Місіс Беларусь», у Мінскім інстытуце развіцця адукацыі мяне падтрымалі, выдзелілі памяшканне і дапамаглі знайсці дзяцей. Звярнуліся ў клуб «Вулей» для прыёмных бацькоў. І вось гэтыя людзі пагадзіліся прывесці сваіх дзяцей у тэатральны гурток. Маёй задачай было знайсці добрых выкладчыкаў-валанцёраў. Так у нас з'явілася Кэці (Кетэван Астрашвілі). Памятаю, адразу прыйшло вельмі шмат дзяцей, каля 30 чалавек, і нам прыйшлося падзяліць іх на групы. Было няпроста. Зараз усё неяк усталявалася, у нас ёсць хлопчыкі і дзяўчынкі, з якімі мы працуем ужо трэці год.

— Якім чынам праходзяць заняткі і рэпетыцыі ў студыі?

— Спачатку мы робім цялесную практыку, гэта падобна на звычайную зарадку. Яна працуе на разняволенне, здымае заціснутасць цела. Нашы падапечныя спачатку былі вельмі скаваныя, асабліва калі толькі пачалі сюды хадзіць. Таму заўсёды спачатку здымаем цялеснае напружанне, потым пераходзім да голасу. Для акцёра голас — гэта галоўны



Свята піцы.

інструмент. Прапрацаваць трэба глыбіню голасу, гучнасць, потым пераходзім да дыкцыі. У канцы рэпеціруем пастаноўкі.

Сама я праводжу лекцыі пра вядомых тэатральных дзеячаў, такіх, як Станіслаўскі, Чэхаў... Чытаем з дзецьмі класічную літаратуру, сучасныя п'есы і разам з імі абмяркоўваем маральны, этычны і культурны бок твораў, падымаем пытанні выхавання. Ва ўсіх нашых падапечных няпростыя лёс. У кожным з іх ёсць трагедыя. І калі з імі чытаеш літаратурныя творы, то праз іх яны прамаўляюць сваё, нешта глыбокае і асабістае. Мая задача — даць дзецям асновы дыкцыі, маўлення... Гэта надае ім упэўненасць у сабе і ў сваіх сілах. У іх ва ўсім маса ўнутраных перажыванняў, я б хацела дапамагчы ім зняць гэты бар'ер, каб яны ў жыцці маглі спакойна камунікаваць. Досвед, які яны атрымліваюць на сцэне, вельмі важны, яны не будуць баяцца адстойваць свае меркаванні, бо іх аргументы будуць гучаць пісьменна. Да нас прыходзяць разумныя дзеці. Той жа Улад. Я яго літаральна бачу на міжнародных канферэнцыях! І ў нас ён навучыцца ўпэўнена трымацца перад публікай. Цяпер інфармацыйная эра, вельмі хуткасная і публічная, мноства розных месенджараў, сетак, аўдыё, відэа... Сёння проста жыццёва неабходна быць у стрыме, у руху, маланкава рэагаваць на сучасныя выклікі. Не варта марнаваць энергію на псіхалагічныя рэчы, накшталт: «не хачу», «страшна», трэба адпавядаць патрабаванням часу. Асновы і інструменты камунікацыі спатрэбяцца ў любой сферы жыцця: на рабоце, дома, у зносінах з сябрамі. Ніколі не ставіла мэты зрабіць з падапечных сапраўдных акцёраў, але гэты вопыт ім абавязкова ў жыцці спатрэбіцца. Гэта тыя навыкі, якія я збірала па крупінках



Кэці і Каця.

усё сваё жыццё, дзе б я ні працавала, у якіх бы праектах ні ўдзельнічала. Адкрыю таямніцу: на мерапрыемствах рознага ўзроўню і дзелавых вечарынах у працэсе зносін наладжваюцца кантакты, ствараюцца новыя праекты. І трэба не згубіцца ў такіх абставінах, быць упэўненым, здолець прэзентаваць свае ідэі.

**— Няўжо з вашай групы ніхто не захадзеў быць акцёрам?**

— Канешне, хацелі! Напрыклад, Кацюша. Ёй ужо 18, і яна хоча паступаць на тэатральнае аддзяленне ў Акадэмію мастацтваў. І Рома таксама. Мы з Кэці дапамагаем ім. Рома яшчэ не вырашыў, у якую ВНУ паступаць, але дакладна ведае, што хоча стаць акцёрам. А мы навучым яго асновам акцёрскага майстэрства. За гэтыя гады ў нас двое дзяцей вызначыліся з будучай прафесіяй, і выдатна, што наша каманда датычная да гэтага.

**— Вы казалі, што ў пачатку быў ажыятаж... Сёння, я паглядзела, дзяцей няшмат.**

— Гэта нармальна і натуральна. Заўсёды будуць дзеці, якім тое, чаму мы вучым, нецікава ці цяжка спасцігаецца. Некаторыя займаліся год, і ў іх з'явіліся новыя інтарэсы, у кагосьці выпускныя класы, і ўсе сілы яны накіравалі на вучобу. Пасля пачатку пандэміі шмат чалавек перасталі з'яўляцца, бо з'ехалі ў вёску з бацькамі ці на ізаляцыі. Але ж сёння ў нас склаўся касцяк тых, хто вельмі хоча займацца. І я гэтаму рада, таму што



Момант разняволення.

працаваць з матываванымі дзецьмі значна лягчэй. Мне, на самай справе, не патрэбныя стадыёны дзяцей. Калі некалькі хлопчыкаў і дзяўчынак атрымаюць досвед, які ім спатрэбіцца ў жыцці, то мая місія выканана.

**— Бываюць дзеці, з якімі цяжка працаваць?**

— У нас Кэці па крыві грузінка, у яе не вельмі пазабаўляешся. Яна будуе сваю работу на дысцыпліне. У нашай сферы нельга быць мяккім. Тут альбо ты прыйшоў і працуеш, альбо не. Калі прыйшоў забаўляцца, то гэта не тое месца. Заняткі праходзяць бясплатна, але мы не дазваляем абясцэньваць нашу працу. Канешне, дзеці, ёсць дзеці. Напачатку было што спазняліся аж на паўгадзіны. Асабліва такое здаралася вясной: птушкі, дрэвы, кузуркі... Кэці пару разоў прыгразіла штрафамі, і ўсё — праблема вырашана. Мы паступова прывучаем дзяцей да думкі, што калі хочаш рабіць нешта прафесійна і атрымліваць вынік, трэба шмат працаваць і быць дысцыплінаваным. Па-іншаму ў жыцці не бывае.

**— Ці страшна было асабіста вам распачынаць работу з дзецьмі, у якіх няпростыя лёсы?**

— Я вельмі перажывала, што не знайду з імі агульнай мовы. Я ж не педагог, не псіхолаг ды ўвогуле ніколі наўпрост не займалася валанцёрскім рухам. Але аказалася, што гэта і не трэба. Мы не «калупаемся» ў душах дзяцей. Проста з імі сябруем і «аднаўляем» іх з дапамогай літаратуры, спектакляў, руху... Мы для іх — Каця і Кэці, толькі ў нас трошкі больш жыццёвага вопыту і магчымасцяў, якімі мы з задавальненнем дзелімся. Мы шмат гаворым з дзецьмі на розныя тэмы, ходзім у тэатры, глядзім спектаклі, бываем за кулісамі, дзеці знаёмяцца з артыстамі... Былі і на Белтэлерадыёкампаніі. Хочацца паказаць ім, што гэты свет «публічнасці» не страшны. Раптам хтосьці з іх натхніцца і захоча стаць журналістам, пісьменнікам ці акцёрам... А гэтым дзецям ёсць што сказаць свету.

**— Ваша студыя існуе ўжо каля трох гадоў. Якія за гэты час зроблены адкрыцці, якія былі расчараванні?**

— Я памятаю нашы першыя сустрэчы. Дзеці былі нібыта ваўчаняты: замкнутыя, напружаныя. Нам спатрэбілася шмат намаганняў, каб яны адкрыліся нам. Яны, ведаеце, не пускаюць у свой свет старонніх, вельмі асцярожныя. Такое можна назіраць і ў навічкоў. Але ўсё ж я не памятаю нейкіх негатыўных момантаў ці расчараванняў. Такога не было. З цеплынёй успамінаю глуханямога хлопца Дзіму. Яго прывялі бацькі, каб ён хоць бы проста пасядзеў і паглядзеў. Бацькі запэўнілі, што ён не будзе прымаць удзелу. Але ж не! Гэта быў артыст № 1. Праз некаторы час яго маці казала, што ў яе хлопчыка адбыўся вялікі зрух у камунікацыі з іншымі. Шкада толькі, што Дзіма цяпер сышоў. У яго распачаліся абавязковыя заняткі, якраз падчас нашых рэпетыцый.

**— Якія яшчэ ў вас ёсць дасягненні, што чакае навічкоў у вашым тэатры?**

— Нашы Раман і Кацярына атрымалі дыпломы лаўрэата 1-й ступені на міжнародным фестывалі мастацтваў @mfest.minsk. Мы вельмі ганарымся. У нас было вялікае свята з гэтай нагоды. Наогул любім ладзіць святы — салодкае свята, піца-свята, торцік-свята!

Цяпер мы хочам пашырацца і запрашаць да нас дзяцей не толькі з замяшчальных сем'яў. Ужо дамовіліся са школьнымі калектывамі пра тое, каб разам рабіць пастаноўкі, хочацца падключыць і музычнае суправаджэнне ў выглядзе хору. Хочам наладзіць кантакты, каб дзеці не баяліся новых знаёмстваў, сумесных работы з іншымі калектывамі. Думаю, у нашага тэатра, нашых дзяцей цікавая будучыня.

# ЕЖА ЯК СТЫМУЛ

**У ААН заклікаюць як мага хутчэй аднавіць праграмы бясплатных абедаў для школьнікаў. Да пачатку пандэміі палова ўсіх вучняў у свеце — 388 мільёнаў дзяцей — атрымлівалі бясплатныя школьныя абеды. Гэта рэкордны паказчык, паведамляецца ў новым дакладзе Сусветнай харчовай праграмы ААН (СХП).**

Да красавіка 2020 года 199 краін закрылі навучальныя ўстановы, і 370 мільёнаў дзяцей засталіся без абедаў — пры тым, што для некаторых з іх гэта была адзіная магчымасць нармальна паесці. Многія праграмы па атрыманні абедаў навучэнцамі былі згорнутыя, і ў СХП асцерагаюцца, што вяртанне да «даковідных» паказчыкаў будзе адбывацца вельмі павольнымі тэмпамі.

«Школьнае харчаванне мяняе да лепшага жыццё дзяцей, абшчын, краін, — кажа кіраўнік СХП Дэвід БІСЛІ. — Гэты адзіны за ўвесь дзень прыём ежы з'яўляецца галоўнай прычынай, па якой галадаючыя дзеці ходзяць у школу. Гэта таксама будзе вялікім стымулам для вяртання іх у навучальную ўстанову пасля таго, як ізаляцыя скончыцца».

У СХП падкрэсліваюць: у раёнах, дзе дзейнічаюць праграмы школьных абедаў для вучняў, паляпшаюцца паказчыкі здароўя дзяцей і падлеткаў, павялічваецца працяглась іх вучобы ў школах, зніжаецца колькасць дзіцячых шлюбаў і выпадкаў цяжарнасці сярод падлеткаў.

У СХП хочуць стварыць у 2021 годзе кааліцыю ў падтрымку хутчэйшага аднаўлення, а таксама далейшага пашырэння праектаў па забеспячэнні школьнікаў абедамі. Арганізацыя імкнецца супрацоўнічаць з урадамі, гуманітарнымі партнёрамі, некамерцыйнымі арганізацыямі і прыватным сектарам.

Плануецца, у прыватнасці, забяспечыць абедамі на 73 мільёны больш школьнікаў, чым да пандэміі. Такім чынам, агульная колькасць вучняў, якія атрымліваюць харчовую дапамогу, можа да канца года дасягнуць 461 мільёна.

Конкурс

## НАС ЧАКАЮЦЬ «СЯМЕЙНЫЯ ГІСТОРЫІ»

**У лютым стартаваў прыём заявак на ўдзел у адкрытым анлайн-конкурсе маладых сем'яў «Сямейныя гісторыі». Заяўкі можна дасылаць да 28 сакавіка на электронную пошту gukcks2019@mail.ru з паметкай «Сямейныя гісторыі».**

Удзельнікамі могуць быць маладыя сем'і, у якіх муж і жонка не старэйшыя за 31 год. Канкурсантам неабходна падрыхтаваць «візітную картку», расказаць пра сваю сям'ю і яе традыцыі, а таксама праінфармаваць пра «клубныя справы» (для членаў клубаў маладых сем'яў) з дапамогай фота ці відэа і эсэ.

Галоўнымі мэтамі і задачамі гэтага мерапрыемства з'яўляюцца ўмацаванне і падтрымка інстытута маладой сям'і, павышэнне ролі маладой сям'і ў дэмаграфічных працэсах грамадства, падтрымка мацярынства, бацькоўства і дзяцінства, а таксама папулярызацыя і прапаганда сярод моладзі сямейнага ладу жыцця, выхаванне праз сям'ю ў падрастаючага пакалення традыцыйных маральных каштоўнасцяў. Арганізатары спадзяюцца, што паспрыяюць развіццю клубнага руху сярод маладых сем'яў.

**Матэрыялы падрыхтавала Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.**

Прыкметы часу

# ДЫХАЦЬ НА ПОЎНЫЯ ГРУДЗІ

## Міфы і праўда аб мамапластыцы

**Прадстаўніцам прыгожага полу заўсёды хочацца нешта змяніць у сваёй знешнасці. І часам жанчыны рашаюцца на кардынальныя крокі. Напрыклад, на пластыку грудзей. Мы пагутарылі з пластычным хірургам аб тым, ці сапраўды новы бюст здольны змяніць да лепшага жыццё жанчыны.**



### Прыгажосць з-пад скальпеля

Мамапластыка, або аперацыя па карэкцыі формы і памераў грудзей — адна з самых запатрабаваных эстэтычных аперацый у свеце. Многія жанчыны імкнуцца зрабіць грудзі ідэальнымі нягледзячы на тое, што гэта звязана з болем, рызыкай ускладненняў і немалымі матэрыяльнымі выдаткамі. І гэта нядзіўна: раскошны бюст — безумоўна, упрыгажэнне жаночай фігуры. Хоць змяняючы і «паляпшаючы» сябе (з дапамогай стылістаў, касметолагаў ці тых жа пластычных хірургаў), мы ў рэшце рэшт хочам не знешніх перамен, а чагосьці больш глабальнага — ні многа ні мала шчасця і жыццёвага поспеху. Але ці працуе гэта? Пра тое мы спыталі ў **пластычнага хірурга Марыны КУРАК.**

— У сваёй практыцы мне даводзілася назіраць выпадкі «псіхамагіі» — часам чалавеку сапраўды неабходныя нейкія знешнія змены для дасягнення жыццёвага поспеху. Часта жанчыны прыходзяць на мамапластыку з верай у тое, што пасля аперацыі іх жыццё зменіцца да лепшага. Гэта няправільная ўстаноўка, і многія пластычныя хірургі лічаць яе супрацьпаказаннем да аперацыі. Але жыццё паказвае: здараецца (і досыць часта), што, вырашыўшы праблему знешнасці, якая яе мучыла, жанчына становіцца больш упэўненая ў сабе. І, як вынік, досыць хутка знаходзіць і добрую работу, і мужчыну, які яе задавальняе. Тут справа не ў хірургіі, а ў псіхалогіі — у пытанні прыняцця сябе. Калі прыняць сябе жанчыне перашкаджае нейкая асаблівасць яе знешнасці (напрыклад, маленькія, вялікія або «не той» формы грудзі) — эстэтычная хірургія ёй дапаможа. Можна, вядома, прыняць сябе і без пластычных аперацый, але гэтае пытанне ўжо ляжыць за межамі прафесійнай сферы хірурга. Калі ж жанчына не прымае сябе ў прынцыпе — яна будзе зноў і зноў змяняць сябе і заўсёды заставацца незадаволенай вынікам: тут патрэбны ўжо не хірург, а псіхолаг.

### Яблык ці груша?

Павелічэнне грудзей да жаданых памераў — гэтая «фішка» засталася ў 90-х. Сёння асноўны запыт да хірургіі грудзей — у першую чаргу прыгожая форма бюста. Прыгажосць — паняцце, якое ўключае як аб'ектыўныя, так і суб'ектыўныя фактары. Аб'ектыўна мы арыентуемся на нейкі агульнапрыняты эталон — такія эталоны прыгажосці ёсць у падсвядомасці кожнага, і яны прыкладна аднолькавыя.

— Існуюць пэўныя параметры. Сасок павінен быць вышэй за ўзровень складкі пад грудзьмі. Грудзі не павінны апускацца ніжэй за яе. Што датычыцца аб'ёму, ён павінен адпавядаць целаскладу, росту, вазе і яшчэ шэрагу індывідуальных параметраў цела канкрэтнай жанчыны. Каб наблізіцца да гэтага эталона, камусьці трэба павелічэнне, камусьці, наадварот, памяншэнне, камусьці — падцяжка, а некаторым — падцяжка і павелічэнне або памяншэнне адначасова.

*— Такім чынам, калі маленькага росту далікатная дзяўчына з нулявым памерам грудзей прыходзіць да пластычнага хірурга і просіць зрабіць ёй бюст «як у Памэлы Андэрсан» — гэта немагчыма?*

— Тэхнічна гэта магчыма. Спатрэбіцца некалькі аперацый. Спачатку трэба будзе паставіць маленькія імплантаты. Скура расцягнецца, і імплантаты можна будзе памяняць на большыя. І так паступова дайсці да жаданага памеру. Але выглядаць вынік усіх гэтых намаганняў будзе непрыгожа, гэта будзе нефізіялагічна і нават небяспечна для здароўя пацыенткі. Асабіста я за выкананне такога запыту не ўзялася б. У першую чаргу мы — урачы, і наш галоўны клопат — здароўе пацыентаў. Прыгажосць у шкоду здароўю — гэта няправільна. Тым больш што ў дадзеным прыкладзе і паняцце «прыгажосць» вельмі сумнiўнае.

Бываюць звароты да пластычных хірургаў і з нагоды памяншэння грудзей — такія запыты таксама не рэдкасць. І тут у першую чаргу жанчыну турбуе не эстэтычнае пытанне, а праблема фізічнага камфорту. Вялікія грудзі — гэта нагрузка на пазваночнік, гігіенічны дыскамфорт у гарачае надвор'е. Ды і складанасці з выбарам бялізны і купальніка.

*— А адкуль бярэцца гэты эталон прыгажосці ў нашай падсвядомасці?*

— На гэты конт існуе мноства тэорый, асноўная з якіх на сённяшні дзень — біялагічная мэтазгоднасць. Яна сцвярджае, што прыгожым нам здаецца тое, што найбольш функцыянальнае з пункту гледжання прыроды. А з пункту гледжання прыроды грудзі жанчыне патрэбны, каб выкарміць сваіх дзяцей. Таму ў грудзей павінен быць аб'ём — у ідэале гэта 350-450 мл.

Дарэчы, хірургі мераюць грудзі не «памерамі» (тымі, якія трэба ведаць кожнай жанчыне пры пакупцы бюстгальтара). «Памер» — гэта «інструмент» мадэлераў і стылістаў. У пластычнай хірургіі грудзі мераюцца на мілілітры.

*— А калі казаць аб форме грудзей — што бліжэй да эталону?*

— Сёння існуюць дзве формы імплантатаў: круглыя і кроплепадобныя. Круглыя ствараюць эфект «пуш-ап без ліфчыка» — як у глянцавых часопісах. Такая форма імплантаў была на піку папулярнасці раней. Сёння круглыя імпланты не так запатрабаваныя, як кроплепадобныя — іх яшчэ называюць анатамічнымі. Натуральныя малочныя залозы заўсёды маюць асноўны аб'ём у сваёй ніжняй частцы — з-за ўздзеяння прыцягнення зямлі. Круглыя імпланты ствараюць эфект напоўненасці і ў верхняй частцы залозы. Анатамічныя — імітуюць натуральныя вельмі прыгожыя грудзі. Чым больш у пацыенткі ўласных тканак, тым больш натуральны будзе вынік.

### Хірург як мастак

Але, акрамя эталона, ёсць яшчэ меркаванне «заказчыцы» аб тым, што прыгожа. І, зразумела, суб'ектыўны погляд «выканаўцы» на гэтае ж пытанне. Таму пластычнага хірурга патрэбна выбіраць, прычым вельмі старанна: у вас з ім павінны быць падобныя ўяўленні аб прыгажосці.

— Зразумела, першапачаткова хірург арыентуецца на стандарты прыгажосці, той самы эталон, пра які мы гаварылі. Але цела кожнага чалавека ўнікальнае, і ў выніку пластыка заўсёды патрабуе персаніфікаванага падыходу.

І вось тут меркаванні кліента і хірурга аб тым, што прыгожа, павінны супасці. У пластычных хірургаў (колькі б гадоў ні працаваў у гэтай сферы спецыяліст) звычайна няма (і не можа быць) вялікага партфоліа з фотаздымкамі работ, якія можна выкласці ў Instagram. Бо яго прафесійныя дасягненні — гэта людзі, якія не хочуць афішаваць, што сталі прыгажэйшыя дзякуючы пластыцы. Зрэшты, свае «работы» спецыяліст можа паказаць на кансультацыі. І на кансультацыі ж гатовы выслухаць і скарэктаваць пажаданні кліента.

— Часам пацыенткі апісваюць, якую форму грудзей яны хацелі б атрымаць у выніку аперацыі, а падчас «прымеркі» аказваецца, што на самай справе яны мелі на ўвазе зусім іншую форму.

Падчас кансультацыі робіцца прымерка так званых сайзераў (ад англійскага 'size' — памер). Гэта імітацыя імплантаў з угінамі на адваротным боку, якая дае магчымасць «прымерыць» «новыя грудзі» на свае ўласныя. Так можна ўбачыць хоць бы прыкладна, як будзе выглядаць вынік аперацыі.

Прыкладна — таму што вынік залежыць ад вельмі шмат якіх фактараў. Ад таго, наколькі расцягнутыя ўласныя тканкі, ад формы грудной клеткі...

— Ад формы грудной клеткі залежыць вось пастаноўкі імплантатаў, — тлумачыць пластычны хірург.

Калі грудная клетка мае востры вугал, імплантаты будуць «глядзець» у розныя бакі, а не ўперад. І нічога тут не зробіш. Можна, вядома, проста надзець бюстгальтар — але жанчыны, адважваючыся на аперацыю, хочуць, каб грудзі выглядалі ідэальна і без бялізны.

Насіць сучасныя імплантаты (калі няма ўскладненняў) жанчына можа ўсё жыццё. Яны запоўненыя гелем і маюць структуру, якая не дазваляе змесціву імплантата выцечы, нават калі яго абалонка будзе пашкоджана. З такімі імплантатамі можна карміць грудзьмі, займацца экстрэмальнымі відамі спорту і наогул жыць поўным жыццём — так, нібы ў вас свае ўласныя грудзі. Якасныя імпланты маюць таксама мікраполікрэтанавае пакрыццё — дзякуючы яму імплантат не ссоўваецца і ствараецца ўражанне зусім натуральных, проста вельмі прыгожых грудзей. Прычым, часта такія імплантаты немагчыма вызначыць нават навобмацак, расказвае спецыяліст.

### Гэта назаўжды?

Аперацыя доўжыцца ад гадзіны да двух. Можа праводзіцца пад агульнай або мясцовай анестэзіяй. Рэабілітацыя залежыць ад асаблівасцяў пастаноўкі імплантата.

— Калі імплантаты ўстаноўлены пад мышцай, аднаўляцца пасля аперацыі пацыентка будзе даўжэй: 15 дзён нельга падымаць рукі, 20 — вадзіць аўтамабіль. Калі ж імплантаты стаяць пад залозай, рэабілітацыя займае 7—8 дзён.

Імплантаты ўстанаўліваюць пры дапамозе некалькіх варыянтаў разрэзаў. Часцей за ўсё разрэз праходзіць пад грудзьмі, у натуральнай складцы скуры. Гэты спосаб лічыцца найбольш бяспечным. Разрэз па мяжы арэолы саска — варыянт, калі пасля загойвання слядоў аперацыі не застаецца наогул. Але гэты спосаб лічыцца больш рызыкоўным — магчымыя ўскладненні.

Выдаліць імплантаты магчыма, калі праз некалькі гадоў уся гэтая прыгажосць жанчыне надакучыць.

— Вярнуцца да ўласнай формы грудзей ужо не атрымаецца, — расказвае хірург. — Але можна зрабіць падцяжку, і ў вас застануцца прыгожыя невялікія грудзі.

Быццам бы можна толькі парадавацца, што мы жывём у XXI стагоддзі, калі індустрыя прыгажосці крочыла так далёка наперад. Але, адважваючыся на мамапластыку, варта ўлічваць, што гэта хірургічнае ўмяшанне — а значыць, вы не застрахаваныя ад ускладненняў.

— Таму на кансультацыі я заўсёды раю пацыенткам, перш чым прымаць рашэнне аб мамапластыцы, спачатку ўзважыць яе плюсы і мінусы, — адзначае суразмоўніца.

Ускладненні могуць паўстаць і не па віне хірурга. Ёсць індывідуальныя асаблівасці арганізма, і часам яго рэакцыю немагчыма спрагназаваць загадзя. Напрыклад, калі справа датычыцца келоідных рубцоў. У некаторых людзей толькі пэўныя зоны цела схільныя да келоідаў, на іншых участках утвараюцца норматрафічныя рубцы, але ні сам пацыент, ні хірург не могуць загадзя ведаць пра такую асаблівасць.

Яшчэ адна рызыка мамапластыкі — развіццё капсульнай кантрактуры. Імплантат, нават самы сучасны, пры ўсёй яго інавацыйнасці — усё ж іншароднае цела ў арганізме. А любое іншароднае цела арганізм імкнецца аддзяліць, адмежаваць ад сябе. І для гэтага стварае капсулу вакол «чужынца». Калі ўсё праходзіць па плане, гэтая капсула тонкая і мяккая, яна непрыкметная і не адчуваецца навобмацак. Але часам адбываецца патаўшчэнне капсулы, яна здаўлівае тканкі і дэфармуе імплантат. У гэтым выпадку патрэбна паўторная аперацыя.

### Бюст — дрэнны «падарунак»

Для каго ж жанчыны рашаюцца на мамапластыку? Часцей усё ж для сябе — каб з задавальненнем глядзецца ў люстэрка. Але часам яны хочуць змяніць сябе для каханага. Дзяўчат і жанчын з такой матывацыяй прыходзіць на прыём да хірурга ў сярэднім каля 10 % ад агульнай колькасці пацыентак. Бюст — гэта сімвал сексуальнай прывабнасці, фізічнай прыгажосці жанчыны. Але, як кажуць псіхолагі, на самай справе мужчыны значна больш лаяльныя да формы і памеру грудзей, чым лічаць жанчыны. Калі казаць аб прывабнасці, значна важнейшы за памер і нават форму бюста характар жанчыны, яе харызма і чароўнасць. І праблемы з разраду «мужчыны не звяртаюць на мяне ўвагу, таму што ў мяне непрыгожыя грудзі», як правіла, існуюць толькі ў галаве жанчыны.

— Вядома, матывацыя «зрабіць грудзі для каханага» — не прычына адназначнай адмовы ў аперацыі. І ўсё ж тут патрэбна папярэдняя работа з псіхолагам. Хірургу важна зразумець, наколькі рэальныя чаканні пацыенткі. Калі чаканні нерэальныя — наўрад ці варта брацца за аперацыю. І ў любым выпадку жанчыны, якія мяняюць форму або памер грудзей «для сябе», маюць больш рэалістычныя ўяўленні пра вынік — і, значыць, пасля аперацыі больш задаволеныя.

Мужчыны, дарэчы, далёка не заўсёды ў захапленні ад такога «сюрпрызу» ад каханай, кажа спецыяліст. Ёсць тыя, каму новыя грудзі жонкі вельмі падабаюцца, ёсць і адваротны варыянт — калі мужчына баіцца дакрануцца да жанчыны, таму што яна паставіла імплантаты, або патрабуе выдаліць іх. Словам, прымаць рашэнне аб мамапластыцы пара павінна разам.

**Дзіяна РОНІНА.**

# ПРАФЕСІЙНА І НЕ ПАД КАПІРКУ

## Спецыяліст па вакале і... па фальклоры

У дзяцінстве мама вадзіла Дзіяну на ўсе магчымыя вакальныя конкурсы, у якіх дзяўчынка займала першыя месцы, таму, калі надышоў час абіраць свой будучы шлях, яна вырашыла, што будзе развівацца менавіта ў музыцы. Яшчэ падчас навучання ў гомельскім каледжы мастацтваў імя Н. Ф. Сакалоўскага, а пасля і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў дзяўчына пачала працаваць у прафесійных калектывах. Праўда, яна паступала на спецыяльнасць «Артыст, кіраўнік калектыву і педагог», аднак на апошнім курсе здарылася рэарганізацыя, і назва спецыяльнасці змянілася — у дыпломе з'явіўся запіс «Спецыяліст па фальклоры». Чаму так атрымалася, Дзіяна і цяпер не можа зразумець. «Гэта ж вялікая галіна, куды ўваходзяць і рамяство, і харэаграфія, і гра на інструментах *(смяецца)*, я ж вучылася насамрэч вакалу...» — расказвае Дзіяна.

**«Вядома, калі захоўваць усе правілы аўтэнтычнага беларускага касцюма, ён, на жаль, будзе выглядаць не так ярка і прэзентабельна, як таго хоча глядач».**

Працу ў калектыве «Валачобнікаў» Дзіяна ўспамінае з асаблівымі пачуццямі, з цеплынёй расказвае пра больш чым дзесяцігадовы вакальны вопыт у заслужаным калектыве «Церніца», што пры мінскім Палацы культуры і спорту чыгуначнікаў. Адначасова з работай у «Церніцы» яна спявала ў загарадным рэстаране. І аднойчы гаспадыня ўстановы прапанавала паспрабаваць сябе ў якасці вядучай. На шчасце, дзякуючы цудоўным педагогам, у Дзіяны быў добры падмурак усіх тых артыстычных уменняў і навыкаў, якімі павінен валодаць сапраўдны творца. Быць вядучай ёй спадабалася, і яна ўсур'ёз занялася арганізацыяй мерапрыемстваў. Пазней сваю справу афарміла афіцыйна. Дзякуючы Цэнтру занятасці і дзяржаўнай праграме «Падтрымка бізнесу» Дзіяна скончыла курсы прадпрымальніцкай дзейнасці і атрымала дзяржаўную падтрымку ў памеры 11 пражытковых мінімумаў — гэта з'явілася своеасаблівым стартам.

«Я павінна быць не толькі артысткай, але і рэжысёрам, павінна ўлічваць, што будзе цікава людзям, у тым ліку з пункту гледжання псіхалогіі, асабліва калі раблю мерапрыемства для дзяцей. Дарэчы, абавязкова ў дзіцячых і не толькі праграмах маю на ўвазе адукацыйную мэту, каб ад мяне выйшлі з новымі ведамі. І паколькі я ўсё ж такі спецыяліст па фальклоры *(усміхаецца)*, заглыбляюся і ў фальклор таксама».

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*



Падчас мерапрыемства Дзіяна выкарыстоўвае напрацаваны творчы вопыт, яе праграмы існуюць толькі ў адзіным экзэмпляры, а ў камандзе — сапраўдныя прафесіяналы. «Колькі разоў я запрашала баяністаў з кансерваторыі — па нотах яны іграюць цудоўна, бездакорна валодаюць тэхнікай выканання, а вось у якасці артыста не ўсе могуць сябе праявіць. Таму для сваіх выступленняў шукаю прафесійных музыкантаў, аднак не ў кансерваторыі!»

Часта Дзіяна выступае не толькі як арганізатар і вядучая, а яшчэ і як экскурсавод, гісторык. Знаёміць з беларускімі абрадамі і звычаямі турыстаў, на святах з нацыянальным каларытам разам з музыкантамі дэманструе старадаўнія народныя інструменты — дуду, жалейку, гуслі, ліру, ахарыну, расказвае, як і калі яны ўзніклі, якім чынам зроблены. «Недастаткова проста паказаць, неабходна яшчэ і сыграць, асабліва калі гэта датычыцца музычнага твора пэўнага стагоддзя. Дзе цяпер такое пачуеш і ўбачыш?»

**«Я працавала ў дзяржаўнай установе педагогам па вакале, да мяне прыходзілі ў гуртох розныя дзеці, і з часам, займаючыся па маёй методыцы, пачыналі спяваць».**

Падчас Раства на шматлікіх карпаратывах творчая каманда Дзіяны абавязкова выконвае калядныя канты — мелодыі XVI стагоддзя, менавіта з гэтага часу была распаўсюджана традыцыя калядных спеваў. «Мы спяваем іх а капэла, шматгалосна. Я напісала тэкст, які гучыць фонам, гасне святло, мы выходзім са свечкамі, спяваем, і ў завяршэнні святло зноў запальваецца. Людзі ў захапленні, бо ёсць і светлавое аздабленне, і пэўны музычны эфект, усё гэта цудоўна ўздзейнічае на ўспрыманне і пачуцці. Ведаеце, многія праз сваю недасведчанасць прывыклі думаць, што падобнае выглядае нудна і сумна, аднак пасля падыходзяць і дзякуюць».

## Каб не было, «як у іншых»

Многія кліенты не ведаюць насамрэч, чаго яны хочуць. Яна ж стараецца пачуць кожнага і падказвае, як зрабіць лепш. Сучасныя вядучыя, па яе словах, калі рыхтуюцца да мерапрыемства, як правіла, шукаюць матэрыялы праз інтэрнэт. Многія ўвогуле не ўлічваюць, што на ўрачыстасці прысутнічаюць розныя пакаленні, розныя па статусе людзі. Неабходна прадугледзець і адно, і другое, і трэцяе, і так прыгожа паднесці, каб зацікавіліся і маладыя, і старэйшае пакаленне, і выкладчык, і сантэхнік.

**«Людзі знаходзяцца ў сваіх коканах, але ж для таго і існуюць танцы ды спевы, каб здымаць стрэс, негатыў».**

Дзіяна праводзіць і майстар-класы па традыцыйных танцах, часцей гэта адбываецца на вяселлях у народным стылі, выкарыстоўвае аўтэнтычныя абрады і звычаі. «Напрыклад, як правільна зняць вэлюм у нявесты ды зрабіць гэта так арыгінальна, каб не было, «як у іншых»? Альбо як запаліць сямейны агмень? На самай справе, калі падняла інфармацыю, аказалася, гэта такое дзейства! Увогуле першы вясельны дзень, — гаворыць Дзіяна, — раней быў сумным, таму спрабую так усё спалучыць, каб госці весяліліся».

На мерапрыемствы ў народным стылі Дзіяна абавязкова надзявае нацыянальны строй. «Вядома, калі захоўваць усе правілы аўтэнтычнага беларускага касцюма, ён, на жаль, будзе выглядаць не так ярка і прэзентабельна, як таго хоча глядач», — дзеліцца яна. Аднак у сваіх убраннях захоўвае асноўны нацыянальны элемент — вышыванку, вельмі ўважліва ставіцца да фасону, фактуры матэрыялу. «Нацыянальнае адзенне прыходзіцца набываць там, дзе яно таннейшае. Так, напрыклад, падчас паездкі ва Украіну купіла сабе кашулю ў традыцыі палескіх строяў, якая каштавала 50 долараў, у Беларусі, на жаль, падобная рэч будзе даражэйшая».

У той жа час расцэнкі на паслугі Дзіяны вельмі даступныя. Вядома, яна магла б заняць і дарагі сегмент з пункту гледжання сацыяльнага ўзроўню — была і такая магчымасць, аднак атрымалася б значна менш заказаў.

«У маёй практыцы быў адзін цікавы выпадак. Сяброўка аднойчы папрасіла: маўляў, у маіх знаёмых ну вельмі мала грошай на вяселле, можа, ты правядзеш? На той момант я якраз была вольная і, каб не сядзець без работы, пагадзілася. Правяла тое вяселле ўсяго за 150 долараў. Аднак спачатку было не па сабе. Прыехала і ўбачыла, што там бацькі — асацыяльныя асобы, прыязджаюць госці — такія ж... У той момант нават не ведала, што рабіць *(смяецца)*. Аднак дзякуючы конкурсам, стылю вядзення ў мяне ніхто не ўжыў лішняга, усе стараліся паводзіць сябе годна, і ў выніку атрымалася «вывесці» гэтае вяселле на высокі ўзровень... А іншым разам прыйшлося весці вяселле ў высокапастаўленай асобы. Мужчына, наперакор дачцэ захацеў, каб менавіта я вяла вяселле, хоць тая прынцыпова жадала ў якасці вядучага запрасіць знакамітасць. Увогуле свята прайшло выдатна, нават з суседніх залаў рэстарана прыходзілі паглядзець нашу праграму!»

## Ці лёгка стварыць казку?

Дзіяна кажа, што сёння людзі знаходзяцца ў сваіх коканах, але ж для таго і існуюць танцы ды спевы, каб здымаць стрэс, негатыў. Можа, таму наша гераіня і адкрыла сваю вакальную школу «Голас» на базе сталічных сярэдніх школ № 52 і № 120. У ёй фундаментальнаму вакалу педагог навучае больш за 40 дзяцей.

На думку Дзіяны, вакал — гэта цэлае мастацтва. Тут усё, як і ў спорце, — неабходны час, веды і трэніроўкі. Ёй сумна бачыць на сцэне людзей, што проста «выдаюць» ноты. За восем заняткаў яна можа падрыхтаваць з вучнем песню, аднак пры ўмове, калі ён чыста інтануе. І нават тады, калі спяваць увогуле не ўмее. «Я працавала ў дзяржаўнай установе педагогам па вакале, да мяне прыходзілі ў гурток розныя дзеці, і з часам, займаючыся па маёй методыцы, пачыналі спяваць».

Паралельна з вакальнай і арганізатарскай дзейнасцю Дзіяна працуе ў Доме культуры ў вёсцы Старое Сяло ў Мінскім раёне, там яна кіраўнік калектываў — дзіцячага «Карамелька» і дарослага «Харашухі». Падчас зімовых свят надыходзіць гарачая пара — яна ператвараецца ў Снягурку. Гэта таксама цэлая навука, бо незалежна ад таго, дарослы ты ці дзіця, святочнае навагодняе шоу — гэта заўсёды казка. «Вельмі сумна, што цяпер многія вядучыя ператварылі яе ў нейкую пошласць. Гэта ж чараўніцтва, яно павінна так прайсці, каб вы паверылі ў цуд, у тое, што ён існуе». Дзіяна ж стварае мініспектакль з удзелам Дзядулі Мароза, казачных персанажаў і саміх жа гледачоў, якія і не заўважаюць, як становяцца героямі гэтай казкі. Аднак, лічыць яна, дзіця абавязкова неабходна падрыхтаваць да сустрэчы з зімовымі персанажамі, а акцёрам у сваю чаргу неабходна добра ведаць дзіцячую псіхалогію. Аднойчы Снягурка-Дзіяна разам з Дзядулем Марозам прыехала да дзіцяці ў загарадны дом. З бацькамі загадзя дамовіліся, што, ідучы да іх, спачатку пагрукаюць у акенца. Аднак, убачыўшы казачных чараўнікоў, дзіця расплакалася. Спатрэбіўся пэўны час, каб супакоіць малое і дабіцца яго прыязнасці.

На развітанне я спытала ў Дзіяны пра сям'ю і далейшыя планы...

— Мой муж Яўген працуе інжынерам-будаўніком, яму падабаецца тое, чым я займаюся. Разам мы часта вандруем па Беларусі, любім ездзіць на мора і ў горы. У нас дзве цудоўныя дачушкі — Амалія і Аніта, яны добра спяваюць, вельмі харызматычныя, іх толькі неабходна скарэктаваць, аднак я ніяк не магу гэтым заняцца. Спадзяюся, што да таго часу, як яны стануць дарослымі, ствару сваю сетку вакальных школ, зраблю ўласную франшызу, бо ў мяне дастаткова ведаў... І добра было б пакінуць ім такі бізнес. Але для гэтага неабавязкова спяваць, дастаткова быць добрым кіраўніком. Увогуле цяпер складана знайсці прафесіянала ў сваёй справе, шмат рэкламы, лоску, і на гэтым непрафесіяналы зарабляюць грошы. Таму абавязкова правярайце, з кім збіраецеся супрацоўнічаць.



**Надзея ЗУЕВА,**
**фота з асабістага архіва гераіні і Таццяны БРАЗОЎСКАЙ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

# ЧЁНКОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ ПРОВОДИТ АУКЦИОН

## по продаже земельных участков в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

| Месторасположение земельного участка | № лота | Площадь земельного участка, га | Целевое назначение земельного участка. Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Сумма задатка, руб. | Затраты на организацию и проведение аукциона, руб. | Наличие инженерной и транспортной инфраструктуры |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Гомельская область, Гомельский район, п. Ченки: ул. Сосновая, за уч. 14** | 1 | 0,1500 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) 321086808601001043 | 11 220,00 | 1 122 | 1 609,12 + расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ | Имеется возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению, водопроводу; расстояние до соц. объектов ≈ 1 км |
| **Гомельская область, Гомельский район, п. Чёнки, ул. 50 лет Победы, за уч. 23** | 2 | 0,1157 | Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома (для размещения объектов усадебной застройки) 321086808601001044 | 8 645,36 | 864,54 | 1 609,12 + расходы по размещению извещения о проведении аукциона в СМИ | Имеется возможность подключения к электроснабжению, газоснабжению, водопроводу; расстояние до соц. объектов ≈ 1 км |

**Аукцион состоится 7 апреля 2021 года в 14.30 в здании Гомельского районного исполнительного комитета (малый зал) по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, д. 51А.**

**Заявления об участии в аукционе и прилагаемые к ним документы принимаются по адресу: Гомельский район, п. Чёнки, ул. Октябрьская, 16, с даты опубликования по 02.04.2021 с 8.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.**

Аукцион проводится в соответствии с Положением, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 года № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

Условия аукциона:

- для участия в аукционе гражданин (либо через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастрового номера и адреса земельного участка, который они желают приобрести в частную собственность, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с Ченковским сельским исполнительным комитетом соглашение установленной формы.

Кроме того, в комиссию представляются:

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан предъявляют документ, удостоверяющий личность.

К участию в аукционе допускаются лица, подавшие в комиссию в указанные в извещении сроки соответствующее заявление с приложением необходимых документов и внесшие задаток в размере, порядке и сроки, определенные в извещении, а также заключившие соглашение.

После получения необходимых документов от гражданина на участие в аукционе комиссия выдает ему билет участника аукциона с указанием даты регистрации заявления и номера, под которым он будет участвовать в аукционе. Данные о каждом участнике аукциона заносятся в книгу регистрации участников аукциона.

Участник аукциона имеет право до начала аукциона письменно отозвать заявление об участии в нем. Неявка участника аукциона приравнивается к письменному отзыву заявления об участии в нем. При этом участнику аукциона в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона возвращается сумма внесенного им задатка.

Прием заявлений и прилагаемые к нему документы на участие в аукционе заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Перед началом аукциона его участники обязаны зарегистрироваться в комиссии и обменять билеты участников аукциона на аукционные номера, которые возвращаются в комиссию или организацию после окончания аукциона.

Сумма задатка перечисляется на Главное управление Министерства финансов Республики Беларусь по Гомельской области № **BY45 AKBB 3641 4142 4003 0310 0000** БИК **AKBBBY2X** в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП **400178309.**

Местный исполнительный комитет вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 рабочих дня до назначенной даты его проведения, о чем участники аукциона извещаются комиссией или организацией. При этом сумма задатка (задатков), внесенная участниками аукциона на отдельный счет местного исполнительного комитета, подлежит возврату им в течение 5 рабочих дней со дня отказа местного исполнительного комитета от проведения аукциона.

Сообщение об отказе от проведения аукциона публикуется в тех же печатных средствах массовой информации, что и извещение.

В течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона победитель обязан внести плату за вычетом суммы задатка за земельный участок, возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка.

В течение двух месяцев со дня подписания протокола о результатах аукциона обратиться в Гомельский межгородской филиал республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка, ограничений (обременений) прав на него (г. Гомель, ул. Войкова, 87).

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности (по предварительному согласованию).

**Справки по адресу: Гомельский район, п. Чёнки, ул. Октябрьская, 16. Тел.: 96-14-59, 8-029-139-14-59.**

# ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНЫХ ЖИЛЫХ ДОМОВ по адресам:

## Гомельская область, Гомельский район, агрогородок Красное, ул. Ленина В.И., участок № 5, участок № 6, участок № 8

## 07 апреля 2021 года

| Наименование объекта | Характер инженерных коммуникаций | Кадастровый номер, земельного участка, адрес, размеры целевого назначения | Вещное право на земельный участок | Начальная цена предмета аукциона | Затраты, подлежащие возмещению победителем аукциона | Размер задатка, подлежащего внесению участником аукциона | Организация, предоставляющая информацию о месте размещения земельного участка, условия и порядок проведения аукциона |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома | Газопровод, электроснабжение, связь | 321084004101001202, Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома, площадь – 0,1100 га, адрес: Гомельский район, аг. Красное, ***ул. Ленина В.И., участок № 5*** | Частная собственность | 8250,00 бел. руб. | Затраты по созданию земельного участка (без опубликования настоящего объявления) 1424,98 бел. руб. | 825,00 бел. руб. | Красненский сельский исполнительный комитет, аг. Красное, ул. Сельсоветская, д. 12 А, тел.: 8 0232-92-35-77, 8 0232-92-35-78 |
**«Несцерка» —** пякуць яго ў Браславе. І ў Віцебску таксама.




**Дыетолагі раяць есці менш хлеба. Але хлеб людзі бяруць і будуць браць заўсёды, упэўнены прадаўцы хлебных крамаў на «Камароўцы».**

Наогул, гатункі, якія сталі брэндамі, ёсць у кожнай вобласці нашай краіны. «Знатны сувенір» — робіць Баранавіцкі хлебазавод, «Дзвінскі» — «Віцебскхлебпрам», «Губернатарскі» — з Магілёва... Хлеб «Несцерка» — своеасаблівы сімвал Беларусі. У яго рэцэптуры — жытняя і пшанічная мука першага гатунку, кмен, павідла і букет прыпраў.

**«Радзівіл» —** хлеб з квасам. Рэцэптура ўключае ў сябе таксама льняную муку і мёд. Бохан, як і ў сорта «Несцерка», важыць 2 кг, прадаюць такі хлеб часцей за ўсё чацвярцінамі.

**«Старажытны Полацк» —** гатунак, які таксама можна прылічыць да «доўгажыхароў». У складзе, акрамя іншых інгрэдыентаў, — мёд і кмен.

**«Траецкі»** вядомы, напэўна, кожнаму мінчаніну. Рэцэптура створана ў Мінску, як можна меркаваць па назве.

— У гэтага хлеба класічны «вясковы» састаў — мінімум інгрэдыентаў, нічога лішняга, — кажа прадавец Таццяна. — Жытняя мука, вада, дрожджы, соль-цукар. Ну, хіба што, яшчэ дададзены бэта-карацін (у арганізме ён ператвараецца ў вітамін А), але гэта прыродны антыаксідант, які ачышчае ад шлакаў і павышае імунітэт. Смак у «Траецкага» саладкаваты, гэта яго фірменнае адрозненне: некаторым гэтая слодыч не падабаецца, але ў гатунку значна больш прыхільнікаў, чым тых, хто яго не любіць. Як для мяне, гэта ідэальны хлеб для ўсёй сям'і: і да супу, і да другой стравы.

**«Беларускі скарб»** пякуць у Слоніме: жытняя мука, мёд і вострыя прыправы забяспечваюць яго насычаны смак. Прадаўцы кажуць, гэты хлеб асабліва смачны, калі яго злёгку падсмажыць на вогнішчы: менавіта яго варта браць на прыроду.

**«Дар Прыдзвіння» —** адзін з самых чорных. У рэцэпт уваходзяць па некалькі гатункаў жытняй і пшанічнай мукі, вострыя прыправы і семачкі сланечніку. Дарэчы, ён ідэальны са свежым вясновым зяленівам і з маладымі агурочкамі-памідорчыкамі.

**«Адвячорак» —** брэнд гарадзенскіх пекараў. Хлеб заварны, у саставе мёд і мука з тапінамбура. Гэты хлеб асабліва смачна есці з салам.

**«Хутарок» —** хлеб з Віцебска, пшанічна-зерневы, дыетычны. У рэцэптуры таксама аўсяныя шматкі і сланечнікавы алей.

**«Благодатный» —** таксама папулярны хлеб, рэцэптура якога распрацавана адносна нядаўна. Хлеб створаны па ўсіх канонах правільнага харчавання: у яго саставе насенне лёну і жытняя заквашаная мука.

## У КОЖНЫМ ДОМЕ

Норма спажывання хлеба, якую рэкамендуюць медыкі для дарослага працаздольнага насельніцтва, складае ад 200 да 250 г у суткі. У сярэднім, паводле статыстыкі, спажыванне хлеба на душу насельніцтва ў суткі ў нашай краіне меншае за рэкамендаваныя лічбы.

— Сёння людзі стараюцца прытрымлівацца правільнага харчавання, а хлеб, як вядома, досыць каларыйны прадукт, — разважае прадавец. — Зноў жа, рытм жыцця паскараецца, і часу на паўнавартасны абед у будныя дні проста няма. Людзі перакусваюць на бягу, вось і спажываецца менш хлеба. А хлеб — гэта ўсё ж такі грунтоўная трапеза з першай і другой стравамі. І ўсё ж хлеб ёсць і заўсёды будзе ў кожным доме — бо гэта традыцыя.

Як выбіраць хлеб? Суразмоўніца кажа, часцей за ўсё ў гэтым пытанні людзі кансерватыўныя. Але, як і ў любой гастранамічнай сферы, і ў яе ёсць пакупнікі, якія любяць спрабаваць новыя гатункі.

Выбіраючы хлеб, пачытайце яго склад на этыкетцы, не абыдзіце ўвагай тэрмін захоўвання і тое, за кошт чаго ён дасягаецца, — з дапамогай кансервантаў або натуральных інгрэдыентаў і спосабу прыгатавання. А лепш за ўсё — спытайце, калі будзеце купляць яго на рынку, у прадаўца. Вам і аб складзе кожнага наймення хлеба распавядуць, і пра яго смак, і параяць той, што абавязкова вам спадабаецца.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by** |
| **Продавец** | **ОАО «Газпром трансгаз Беларусь», г. Минск, ул. Некрасова, 9** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**
**Капитальное строение, расположенное по адресу: Брестская обл., Каменецкий р-н, г. Высокое, ул. Советская, д. 114**

| Наименование (назначение) | Инв. номер | Общ. площадь |
|---|---|---|
| **Гаражи на 4 автомашины** (здание нежилое) | 102/С-9461 | 89,3 кв. м |

***Сведения о земельном участке***: пл. 0,0245 га, предоставлен на праве аренды сроком по 31.12.2114 для обслуживания здания гаража на 4 автомашины

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 8 280,00 белорусского рубля**

**Порядок ознакомления:** в рабочие дни с 08.00 до 17.00, +375 (33) 673 28 47 (Мизюк Наталья Леонтьевна)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; нерезидентами РБ задаток может перечисляться в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – BY76BLBB30120191021390001004; в евро (EUR) – BY33BLBB30120191021390001002; в российских рублях (RUB) – BY22BLBB30120191021390001006 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **20 (двадцать) рабочих дней** после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов, либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, а также оплатить организатору торгов вознаграждение в размере 3 (трех) процентов от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

**Условия электронных торгов:** оплата государственной пошлины за государственную регистрацию договора купли-продажи производится Покупателем. Расходы по государственной регистрации перехода прав на объект недвижимости возлагаются на Покупателя

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» от 09.02.2021

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 10.00 17.03.2021**<br>**Окончание торгов: 12.00 17.03.2021**<br>Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 16.03.2021 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **+375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

**Организатор торгов ЗАО «Белреализация» уведомляет, что назначенные на 09.03.2021 г. электронные торги по продаже имущества УП «Комбинат декоративно-прикладного искусства им. А. М. Кищенко» (УНП 600126458) отменены.**
Извещение о проведении торгов опубликовано в газете «Звязда» от 05.02.2021 г. и на BELTORGI.BY.
УНП 600126458

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703.** |
| **Продавец** | **ОАО «ТРЕСТ № 26 ЖЕЛЕЗОБЕТОНМОНТАЖ», г. Минск, 220073, ул. Харьковская, 15, +375173958917, +375293928906** |

**Предмет аукциона**
**Имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 16, пом. 1 в составе**

**1. Помещение, расположенное в производственном корпусе** (помещение неустановленного назначения) общей площадью согласно ЕГРНИ 1010 кв. м, инвентарный номер 500/D-693449; 2. Асфальтобетонное покрытие (инв. номер 509); 3. Кран-балка т/и 3,2 тн (инв. номер 44); 4. Трансформатор понижающий 380-36 (инв. номер 233); 5. Установка автономного отопления «byderys» g 155/21 (инв. номер 298); 6. Сторожка АТУ 9,2006

**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве аренды (по 16.05.2029 г.) для обслуживания зданий специализированных транспорта общей площадью 4,6092 га (доля Продавца 1832/10000)

**Начальная цена без НДС** – 1 069 290,00 белорусского рубля
**Шаг аукциона** – 53 464,50 белорусского рубля

Порядок ознакомления с предметом аукциона: осуществляется в рабочие дни с 9.00 до 16.00. Ответственное лицо: Быковский Леонид Эдуардович, тел. +375 (29) 654 92 93

**Дополнительная информация**: 1. Обременение: аренда.
2. Регистрация перехода права собственности на предмет аукциона к Покупателю будет осуществляться в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь № 63 от 05.02.2013 «О некоторых вопросах правового регулирования процедур экономической несостоятельности (банкротства)».
3. Государственная регистрация договора купли-продажи и перехода права собственности на объекты недвижимости осуществляется Покупателем самостоятельно за свой счет

Лица, желающие принять участие в торгах, обязаны внести задаток и подать организатору торгов в установленный срок заявление с приложением всех необходимых документов

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X. Получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки», УНП 191021390

**Порядок оформления участия в торгах, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов определяется ст. 127, 128, 129 Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)»**

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее **30 (тридцати) дней** со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору в размере 2 % от цены продажи предмета аукциона в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Подробная информация о проведении аукциона размещена на сайте www.cpo.by

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 16.01.2021 г. и в ЕГРСоБ 15.01.2021 г.

**Аукцион состоится 19.03.2021 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703**

**Для участия в аукционе необходимо перечислить организатору торгов задаток, а также подать заявление с приложением всех необходимых документов в срок с 9.00 04.03.2021 до 17.00 17.03.2021 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Контактные телефоны: +375 29 317-95-42; +375 44 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

Закрытое акционерное общество «Смолевичи Молоко»
*(место нахождения: 222201, Республика Беларусь, Минская обл., г. Смолевичи, ул. Социалистическая, 54 б)*
**сообщает, что директором ЗАО «Смолевичи Молоко» 03.03.2021 г. принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг.**
Формирование реестра акционеров осуществляется по состоянию на 03.03.2021 г.
УНП 690668083

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Продавец | ООО «МилкПакинг»; юридический адрес: 220099, г. Минск, ул. Казинца, д. 33, корп. 10, каб. 3; УНП 192491719 |
| Организатор торгов | Ликвидатор ООО «МилкПакинг» – индивидуальный предприниматель Харкович Андрей Михайлович, г. Минск, ул. Серова, д. 2а, пом. 34, тел. 8 (017) 236-50-24 |
| Контактные данные | По вопросам, связанным с осмотром объекта продажи, обращаться по телефону 8 017-236-50-24 |
| Предмет торгов | **Лот 1.** Линия для производства багетов WP.<br>**Лот 2.** Фритирующая линия для производства берлинеров Kalt Sohne.<br>**Лот 3.** Металлизатор вакуумный General Engenereeng, 2009 г. в., обременение – залог |
| Начальная цена предмета торгов | **Лот 1.** 109 296,00 бел. руб., в т. ч. НДС 20 % – 18 216,00 бел. руб.<br>**Лот 2.** 81 216,00 бел. руб., в т. ч. НДС 20 % – 13 536,00 бел. руб.<br>**Лот 3.** 2 390 871,60 бел. руб., в т. ч. НДС 20 % – 398 478,60 бел. руб. |
| Сумма задатка | **Лот 1.** 109,30 бел. руб. – 0,1 % от начальной цены предмета торгов.<br>**Лот 2.** 81,22 бел. руб. – 0,1 % от начальной цены предмета торгов.<br>**Лот 3.** 2 390,87 бел. руб. – 0,1 % от начальной цены предмета торгов |
| Шаг аукциона | 5 % от первоначальной цены |
| Открытый аукцион состоится | **15.03.2021 в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Серова, д. 2а, пом. 26б (комната переговоров)** |
| Заявления и документы на участие принимаются | В рабочие дни с 8.30 до 17.00 по 14.03.2021 включительно по адресу: г. Минск, ул. Серова, д. 2а, пом. 34 |

Для участия в открытом аукционе предоставляется заявление, к которому прилагается документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка в размере 109,30 бел. руб. за Лот 1, 81,22 бел. руб. за Лот 2 и 2 390,87 бел. руб. за Лот 3 на счет № BY71 ALFA 3012 2723 4400 3027 0000 в ЗАО «Альфа-Банк», БИК ALFABY2X, УНП 192491719.

Заключительная регистрация участников аукциона – 15 марта 2021 года с 9.30 до 9.55. Победителем открытого аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны подписать протокол о результатах аукциона.

Договор купли-продажи по результатам проведения аукциона должен быть подписан в течение 30 банковских дней с момента утверждения организатором аукциона протокола о результатах аукциона. Оплата предмета аукциона осуществляется денежными средствами по безналичному расчету в течение 30 банковских дней с момента подписания договора купли-продажи.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом в течение 30 (тридцати) рабочих дней со дня проведения торгов.

Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи.

Ссылки на ранее опубликованные извещения:
Газета «Звязда» № 7 (29376) от 15.01.2021;
Газета «Звязда» № 15 (29384) от 27.01.2021.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «СМТ № 8», г. Минск, ул. Пионерская, 37** |

**Предмет аукциона (одним лотом)**
Месторасположение:
**Гомельская обл., г. Гомель, ул. Добрушская, 91А и 91Д**

Производственная база в составе: **склад РМХ-20** (350/С-174808, 193,5 кв. м), **здание матер. склада № 2** (350/С-56797, 478,6 кв. м), **здание административно-бытовое** (350/С-56799, 550,5 кв. м), **гараж** (350/С-56788, 675 кв. м), **склад по обогреву инертных материалов** (350/С-56798, 29,6 кв. м), **склад масел** (350/С-56822, 23,5 кв. м), **здание матер. склада № 1** (350/С-56796, 1072,5 кв. м), **склад цемента** (350/С-56819, 33 кв. м), **проходная** (350/С-56823, 14,8 кв. м), **компрессорная** (350/С-56820, 62,6 кв. м), **котельная** (350/С-56800, 110 кв. м), **ограждение и бетон. площадка производ. базы** (350/С-204615, составные части: ограждения – ж/б – 468,1, 316,0 и 1214,5 кв. м, из метал. сетки – 11,5 кв. м, деревянное – 17,1 кв. м, металлическое – 4,8 кв. м, кирпичное – 4,3 кв. м; ворота, калитка, площадка бетон., покрытия).
***Сведения о земельном участке:*** предоставлены на праве постоянного пользования пл. **4,4874** га для эксплуатации и обслуживания администрат. и производственно-склад. помещений производ. базы и пл. **0,5576** га для эксплуатации и обслуживания зданий специализир. складов, торг. баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ. Обременения прав на зем. уч. 0,5576 га – охранные зоны линий связи и радиофикации, электрич. сетей, сетей и сооружений водоснабжения и канализации

***Обременения***: площади здания матер. склада № 2, бетон. площадка, склад масел, часть помещений гаража и здания матер. склада № 1 сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 50 822,38 бел. руб.**
(снижена на 78 %)

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в ОАО «Белинвестбанк» (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 21.01.2021

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

**Дата и время проведения аукциона: 16.03.2021 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703.
**Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 15.03.2021 до 17.00** по указанному адресу

**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## ТЕРЕШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ
### проводит аукцион по продаже в частную собственность гражданам земельных участков, расположенных на территории Терешковичского сельсовета

| Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение | Характеристика расположенных на земельном участке инженерных коммуникаций и сооружений | Начальная цена предмета аукциона, руб. | Расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, подлежащие возмещению победителем аукциона, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 321088803101000177, Гомельская область, Гомельский район, д. Новые Терешковичи, участок № 2, площадь 0,1310 га, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Расположены инженерные коммуникации – сети электроснабжения, водоснабжения. Дорога в гравийном исполнении | 5144,37 | 830,93 | 514,44 |
| 321088803101000178, Гомельская область, Гомельский район, д. Новые Терешковичи, участок № 4, площадь 0,1388 га, для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | Расположены инженерные коммуникации – сети электроснабжения, водоснабжения. Дорога в гравийном исполнении | 5450,68 | 836,68 | 545,07 |

**Аукцион проводится 7 апреля 2021 года в 15.00 по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51А, большой зал заседаний.**

Заявления об участии в аукционе и прилагаемые к ним документы принимаются по адресу: Гомельский район, агрогородок Терешковичи, ул. Совхозная, 11а, каб. 3, с даты опубликования по 05.04.2021 с 8.00 до 17.00, обед с 13.00 до 14.00, выходные дни – суббота, воскресенье.

**Условия участия в аукционе.**

Для участия в аукционе гражданин (лично либо через своего представителя) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет BY79AKBB36414142000123100000 филиал № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, получатель платежа: Терешковичский сельский исполнительный комитет, УНП 400227059, код платежа **04901**, а также заключает с Терешковичским сельским исполнительный комитетом соглашение установленной формы.

Да свята

# Проста так жыццё не стане казкай

**Маладзёжны тэатр эстрады па традыцыі будзе радаваць сваіх гледачоў святочнымі праграмамі напярэдадні 8 Сакавіка. Нас чакае дзве прэм'еры — «Марафон жаданняў» і «Грэчаскі дзявочнік». Першая праграма раскажа, якія жаданні жывуць у думках жанчын, і дазволіць паназіраць, як на гэта ўплываюць тыпажы Бландзінка, Брунетка і Рудая. А вось другая шоў-праграма заснавана на вядомай многім гісторыі «Дзённік Брыджыт Джонс». Мы распыталі выканаўцу галоўнай ролі «Грэчаскага дзявочніка», актрысу Кацярыну МУРАТАВУ, пра яе гераіню.**



***— Дык якая яна, беларуская Брыджыт Джонс?***

— Сімпатычная, мілая, абаяльная, таварыская і ўмее глядзець на жыццё з іроніяй. Яна выглядае недарэчна толькі тады, калі імкнецца іграць нейкую ролю, а калі ж застаецца самой сабой, то выглядае вельмі шчыра, чулліва і забаўна. Яна марыць аб прыгожым прынцы, які скажа ёй: «Ты падабаешся мне такой, якая ты ёсць! Я кахаю цябе». І жыццё ператворыцца ў казку...

***— А што для вас значыць гэтае ўжо класічнае «быць самой сабой»?***

— На маю думку, гэта, перш за ўсё, уменне чуць свой унутраны голас, здольнасць увасабляць у жыццё покліч душы, не звяртаючы ўвагі на ўстаноўкі грамадства. Вельмі складана зразумець, што табе патрэбна на самай справе, калі ты знаходзішся ў зоне дыскамфорту, і нашмат прасцей, калі ўмовы спрыяльныя. Выдатны спосаб пагладзець на сябе сапраўдную — гэта ацаніць свае паводзіны дома. А ўсё, што пачынаецца з першага кроку за парог кватэры, — гэта надзяванне маскі.

***— Што такое жаночая дружба, і ці ўсё ж існуе яна?***

— Безумоўна, яна існуе. Дружба — гэта дзівосная і ў пэўнай ступені ўнікальная з'ява ў жыцці кожнага з нас. Я нават не магу сказаць напэўна, хто сябруе лепш, мужчыны ці жанчыны. У кожнага з нас свае прыклады такіх адносін.

***— Ці варта з сяброўкамі дзяліцца ўсім, у прыватнасці сакрэтамі? І хто найлепшы дарадца для жанчыны?***

— Думаю, сакрэтамі варта дзяліцца, бо для гэтага яны і існуюць! Толькі рабіць гэта трэба з самымі дарагімі і блізкімі сэрцу людзьмі. Але пры любых абставінах найлепшы дарадца для жанчыны — гэта яна сама. Толькі яна ведае, што, калі і ад каго ёй патрэбна.

***— Якіх ахвяр не вартая ідэальная знешнасць?***

— Прыгажосць не заўсёды дапамагае. Мы часам прыпісваем ёй занадта вялікае значэнне, забываючы пра іншае... Чалавек павінен быць шчаслівы! Калі ён шчаслівы — тады прыгожы!

***— Як думаеце, ад таго, бландзінка ты, брунетка ці шатэнка, нешта залежыць?***

— Не важна, які колер тваіх валасоў, — галоўнае, каб чалавеку было камфортна ў сваім вобразе. Калі жывеш у гармоніі з сабой і навакольным светам, то ўсе дзверы перад табой адкрытыя. Важна любіць сябе і верыць у свае сілы, і не баяцца памыляцца. Толькі так удаецца знайсці жыццёва патрэбную гармонію.

***— На чым трымаецца сямейнае шчасце, і як зберагчы пачуцці на ўсё жыццё?***

— Шчаслівая сям'я — гэта не лёс і не ўдача, а пастаянная праца двух людзей, якія кахаюць адно аднаго. Без пачуццяў сямейнага шчасця не пабудуеш, і нават спрабаваць не варта. Да кахання трэба дадаць разуменне, увагу, уменне прасіць прабачэння і прабачаць, а таксама крыху самаахвярнасці... Хоць і гэтага яшчэ мала. Але самае галоўнае звяно ў гэтым ланцужку — жанчына. Яна і ёсць тая сіла, якая беражэ сям'ю. У мужчыны, вядома, таксама ёсць свая роля ў адносінах, і ён па-свойму робіць унёсак у стварэнне шчасця ў сям'і. Аднак прымусіць кагосьці мяняцца ці рабіць тое, што нам хочацца, даволі складана. А саму сябе змяніць лягчэй, таму і пачынаць будаваць шчасце трэба з сябе.

***— Чаго вы пажадалі б сабе, найлепшай сяброўцы і ўсім тым жанчынам, якія, магчыма, зараз у нечым расчараваліся?***

— Тут згадваецца цытата з фільма «Я не магу вярнуцца назад і паўтарыць тыя ж памылкі. Я павінна ісці далей і рабіць новыя». Давайце будзем любіць сябе і свае памылкі, бо гэта і ёсць гармонія!

**Алена ДРАПКО.**
**Фота з архіва гераіні.**

Новыя кнігі

# «Сонечны гадзіннік» Максіма Танка

**У «Мастацкай літаратуры» выйшла новая кніга класіка беларускай літаратуры, народнага паэта Беларусі Максіма Танка (1912—1995). Зборнікам «Сонечны гадзіннік» прадаўжаецца перавыданне творчай спадчыны найлепшых мастакоў слова ў серыі «100 вершаў». Раней у гэтай серыі пабачылі свет кнігі Пімена Панчанкі, Яўгеніі Янішчыц, Аркадзя Куляшова, Ніла Гілевіча, Міхася Стральцова... Сапраўдная бібліятэка найлепшых паэтычных здабыткаў у беларускім прыгожым пісьменстве!**




«Я ведаў, што ты — бліскавіца,/ Што хмары рассекла;/ Я ведаў, што ты — вызваленне/ З няволі і пекла./ Вясновая кветка,/ Што камень прабіла магільны,/ Разведчыка след/ На дарозе крамністай і пыльнай», — напісаў сваё пасланне нашчадкам у вершы «Паэзія» Максім Танк яшчэ ў 1955 годзе. Чытаючы, задумваешся, які быў той 1955 год для мастацкіх, эстэтычных пошукаў, якія ў той час выходзілі вершы з-пад пяра іншых беларускіх паэтаў. У тым 1955 годзе вялікі мастак слова назваў паэзію крывёю, «што пульсуе па жылах», ды быў упэўнены, што без паэзіі нельга «як без маці,/ Або без радзімы,/ Ні нараджацца, ні жыць/ На зямлі немагчыма!»

Укладальнікам серыі зборнікаў паэзіі пад «брэндам» «100 вершаў» выступае паэт Віктар Шніп, творца з чуйным мастацкім густам, пісьменнік, якога добра ведаюць сённяшнія чытачы нашай краіны. Выданне, якое ажыццёўлена па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, ілюстравана рэпрадукцыямі карцін Вітольда Бялыніцкага-Бірулі з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, што пашырае эстэтычную асалоду пры знаёмстве з кнігай вершаў «Сонечны гадзіннік», дадае фарбаў у працэс паэтычнага выхавання чытача. Тыраж зборніка — 500 экзэмпляраў. Набыць кнігу перш-наперш магчыма ў кнігарнях «Белкнігі» па ўсёй краіне, а таксама ў «Акадэмкнізе» ў Мінску па адрасе: праспект Незалежнасці, 72.

Прыемнага ўсім знаёмства з вершамі Максіма Танка!

**Кастусь ЛЕШНІЦА.**

# НЯБРОНЗАВАЯ ПАМЯЦЬ

**У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны прайшоў вечар, прысвечаны 125-годдзю з дня нараджэння народнага пісьменніка Кандрата Крапівы. Унучка знакамітага творцы, апантаная захавальніца памяці не толькі пра пісьменніка, але і пра эпоху, якая звязана з Кандратам Кандратавічам, кандыдат мастацтвазнаўства, загадчык кафедры дызайну моды БДУ Алена АТРАХОВІЧ падзялілася сваімі ўспамінамі.**



— Калі я вывучала жыццё свайго дзеда, знаёмілася з дакументамі, літаратурай, высветліла, што пра яго напісана вельмі шмат, аднак галоўным чынам гэта літаратуразнаўчыя артыкулы ці кнігі пра яго навуковую работу. А пра яго як чалавека літаратуры не хапала. Часта мы можам заўважыць, што вобраз знакамітага чалавека з цягам часу бранзавее, ператвараецца ў пэўную схему. Каб гэтага не здарылася, я вырашыла напісаць кнігу пра свайго дзеда, дзе расказваю пра яго менавіта як унучка, якая яго добра памятае, эмацыянальна.

У кнізе, што выйшла летась у выдавецтве «Мастацкая літаратура», сабраныя ўспаміны родных, у тым ліку жонкі Кандрата Крапівы. Пададзена багата малавядомых фактаў пра пісьменніка. Усе ведаюць байкі і п'есы народнага пісьменніка, а вось яго драматычныя творы не так «раскручаны», хоць сам Кандрат Кандратавіч часам жартаваў, што «не падпісваў дамову быць толькі сатырыкам» . Апошняя яго п'еса «На вастры» распавядае пра маральна-этычныя праблемы медыцыны. Некаторыя яго творы — сведчанне эпохі, як, напрыклад, п'еса «Партызаны».

Ніхто, акрамя самых блізкіх людзей, не ведаў, што п'есу «Проба агнём», якую Кандрат Крапіва напісаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, ён прысвяціў свайму старэйшаму сыну, які загінуў падчас Сталінградскай бітвы, Барысу Атраховічу. Галоўнага героя п'есы таксама завуць Барысам. Толькі на літаратурных старонках Барыс застаецца жывы. Назаўсёды.

Гэтай сямейнай трагедыяй Алена Атраховіч таксама вырашыла падзяліцца. У сям'і захаваліся лісты з фронту, што прыходзілі ад Барыса, а ў іх — боль і жахі, праз якія ў гады вайны прайшлі раскіданыя, разлучаныя сем'і. Так, Барыс у лісце да бацькі прызнаваўся, што пасля вестак пра бамбёжкі Мінска баяўся, што страціў сваю сям'ю: «Я ўжо быў падрыхтаваны да таго, што пасля вайны не сустрэну ні родных, ні сяброў, што давядзецца прабіваць сабе дарогу самому без усялякай дапамогі. Адзін. Як гэта жудасна гучыць. Уяві сабе дрымучы лес. Навокал змрок, цемра, і ты ідзеш адзін не па пратаптаных сцежках, а прадзіраешся праз дрымучае кустоўе і зараснік, і навокал толькі дзікія звяры, гатовыя кожную хвіліну разарваць цябе на кавалкі. А ты адзін, без надзеі, без падтрымкі, без абароны». Дарэчы, па ваенных лістах сына Кандрата Крапівы рэжысёрам Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Алегам Вінярскім быў створаны радыёспектакль «Пісьмы, вернутыя з небыцця», урыўкі з якога прагучалі падчас памятнай сустрэчы ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Багата ўспамінаў пра Кандрата Крапіву пакінулі яго сябры і калегі, яны таксама выкарыстаны ў рабоце Алены Атраховіч. Так, у пасляваенныя гады, калі Кандрат Крапіва ўзначаліў часопіс «Вожык», з ім працавала Лідзія Арабей, якая прызнавалася, што Кандрат Кандратавіч быў немнагаслоўны, усміхаўся даволі рэдка, нібы саромеючыся, што на той час здавалася дзіўным, бо ад сатырыка чакалі іскрыстай весялосці і россыпу вострых слоў. Яна пакінула яркія замалёўкі з жыцця часопіса: «У той час у «Вожыку» працавалі Максім Танк, Максім Лужанін, Янка Брыль, і хоць тады яны былі не такія знакамітыя, як сёння, але талент асвятляў іх размовы і друкаваныя радкі. Разы два на месяц у рэдакцыі праводзіліся так званыя тэмныя нарады, абмяркоўваліся тэмы для сатырычных малюнкаў, што потым выконваліся мастакамі... Спіс тых, хто не мог падвяргацца сатырычнаму асмяянню, быў даволі доўгі, і знаходзіць дазволеныя тэмы бывала цяжкавата. І ўсё ж яны знаходзіліся і, калі іх зачытвалі, маладыя хлопцы-супрацоўнікі выбухалі рогатам, толькі Кандрат Кандратавіч чырванеў і сціпла ўсміхаўся. Кандратавіч рабіў, як той казаў, залатое яечка. Паварочваў яе іншым бокам — і тэма рабілася вясёлай, смешнай. Часам і ён прапаноўваў тэму для сатырычнага малюнка і тут вельмі трапна падаў у цэль».



Бывала, што прапаноўваліся тэмы, якія нельга было прыняць, без гумару, нецікавыя. Тады ўсе маўчалі, чакаючы рэакцыі галоўнага рэдактара — ён мусіў вынесці канчатковы прысуд. І Кандрат Крапіва зноў чырванеў і тут нейкім трапным словам даваў аўтару зразумець, што зрабіць па ёй вясёлы малюнак аніяк немагчыма. А бывала і так, што з нецікавай нявострай тэмы Кандрат

На творчую сустрэчу завіталі і героі баек Крапівы — з малой радзімы пісьменніка прыехалі навучэнцы сярэдняй школы № 2 імя Кандрата Крапівы, удзельнікі тэатральнай студыі «Вітамін».

Таксама ў музеі адкрылася часовая экспазіцыя, дзе можна ўбачыць фатаграфіі, дакументы і асабістыя рэчы Кандрата Крапівы.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

Кніжны гасцінец

# ДЗВЮМА ПАРАМІ ВАЧЭЙ

**Алесь Пальчэўскі. Рэкс і Казбек. Мастацкая літаратура, 2020.**




Невялічкія, але вельмі прыгожыя і зручныя кніжачкі серыі "Я люблю чытаць" прыплываюць да вас на хвалях цікавасці дасціпнымі рыбкамі — менавіта так, напэўна, можна растлумачыць лагатып серыі. Рыбак у лагатыпе дзве пары, яны ж сімвалізуюць дзве пары вачэй — дзіцяці і дарослага, запрашаючы да сямейнага чытання. У гэты выпуск серыі ўвайшлі апавяданні Алеся Пальчэўскага, кранальныя, светлыя і ненавязліва павучальныя. Пальчэўскі рыхтаваў свой першы зборнік твораў для дзяцей яшчэ ў 1930-х, калі працаваў у дзіцячым часопісе «Іскры Ільіча». Але быў арыштаваны, рукапіс знік, а для аўтара пачаліся доўгія гады хаджэння па пакутах — лагер, праца лесарубам, паўторны арышт... Але інтэлігентнасць сваю, дабрыню і мужнасць Пальчэўскі захаваў на працягу жыцця, і сваёй жонцы, сустрэтай у высылцы грузінскай актрысе Тамары Цулукідзэ, заяўляў: «Асоба ў любых умовах застаецца тым, што яна ёсць. Трэба толькі паклікаць усю сілу волі і выстаяць!» І гэтая цэльнасць натуры адчуваецца ў творах.

У апавяданні, якое дало назву зборніку, трое паляўнічых на прывале (класічная карціна!) расказваюць гісторыі пра сваіх сабак. Рэкс, напрыклад, належаў узятаму ў палон нямецкаму салдату. Нялёгка было савецкаму воіну Паўлу, які шчыра пашкадаваў сабаку, заваяваць ягоны давер... Але дабрыня не бывае марнай — і Рэкс не раз ратаваў Паўлу жыццё. А чатырохлапы сябар другога паляўнічага, Казбек, сядзеў калісьці на ланцугу ў каўказскай вёсцы, быў страшэнна злы... А калі аказаўся моцна параненым, гаспадар не стаў яго лячыць. Толькі кватарант з навуковай экспедыцыі, на якога Казбек яшчэ нядаўна кідаўся, пашкадаваў параненага, адратаваў... І той адплаціў сапраўднай вернасцю.

Дарэчы, каларыт далёкіх краёў, дзе аўтар пражыў шмат гадоў не па сваёй волі, адчуваецца — горы, суровыя лясы, бурлівыя рэкі, у якіх мядзведзі ловяць стронгу... Кніжка адметна аформлена мастачкай Вольгай Дзятко: выявы герояў зроблены з керамікі, тканіны, кавалачкаў кары, так, што хочацца іх паўтарыць у матэрыяле самому.

**Дэніэл Кіз. Кветкі для Элджернана. Масква, Эксма, 2020.**




Гэта адна з тых кніг, што зміняюць свядомасць. Невялікі празаічны твор, аднесены да жанру навуковай фантастыкі, трывала ўвахodзіць у топы чытацкага попыту і рэйтынгі крытыкаў. Фантастычны элемент тут вельмі ўмоўны... Проста падстава для сур'ёзнай і шчымлівай размовы пра людскую нецярпімасць і людскую дабрыню. Пра тое, чым гатовы плаціць чалавек за жаданне быць самым разумным. І пра тое, што значнасць асобы зусім не вымяраецца яе сацыяльным, відочным, статусам... Вечнае супрацьстаянне: інтэлект без дабрыні і чалавечнасці і прастасць дабрыні. Галоўны герой, Чарлі Гордан, інтэлектам не вызначаецца... Як зараз кажуць, чалавек «з асаблівасцямі». Ён вельмі хоча стаць разумным... А калі такая магчымасць даецца — інтэлект Гордана з дапамогай эксперыментальнай тэхналогіі пачынае імклівa расці — шмат што мяняецца... І не заўсёды да лепшага. Гордан, добрая, чулая істота, які лічыў усіх сваімі сябрамі, раптам усведамляе, што з яго, разумовага калекі, увесь час насміхаліся, ім пагарджалі... Цяпер ягo чарга глядзець звысоку на іншых. Але ці ў гэтым шчасце? Бо сказана ж у Пісанні, што ў вялікім веданні шмат смутку... Тэкст лёгка і дынамічна чытаецца. Ён пададзены ў выглядзе дзённіка Чарлі Гордана, што дало аўтару магчымасць гуляцца са стылем, перадаваць унутраныя змены героя праз плынь ягоных думак. Развязка нечаканая... Некаторыя палічаць яе трагічнай. Сапраўды, фінал зусім не пераможны для героя, але ўсё-ткі не пакідае прысмаку безнадзейнасці. Гордан, які ўзняўся да ўзроўню генія, вялікага вучонага, сам вылічвае, што эфект ад праведзенага над ім эксперымента часовы... Адчуваць, як ты дурнееш, страчваеш веды... Страшнае выпрабаванне. Але тыя перамены, што за гэты час адбыліся ў свядомасці людзей, якія атачаюць Гордана, вартыя былі ягоных пакут.

А хто такі Элджэрнан? Ну, я ўжо і так дастаткова нарабіла спойлераў... Даведаецеся самі — здзівіцеся.

**Выданні для агляду дадзены кніжнай крамай «Акадэмічная кніга», Мінск, пр-т Незалежнасці, 72.**

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 7.51 | 18.53 | 11.02 |
| Віцебск — | 7.42 | 18.41 | 10.59 |
| Магілёў — | 7.41 | 18.43 | 11.02 |
| Гомель — | 7.36 | 18.41 | 11.05 |
| Гродна — | 8.05 | 19.08 | 11.03 |
| Брэст — | 8.04 | 19.11 | 11.07 |

### Месяц

*Поўня 27 лютага.*
*Месяц у сузор'і Скарпіёна.*

### Імяніны

**Пр.** *Архіпа, Багдана, Макара, Максіма, Фёдара, Філімона, Фядота, Яўгена.*
**К.** *Люцыі, Казіміра, Яўгена.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




### УСМІХНЕМСЯ

**— Тата, а чаму пра адных людзей кажуць, што ён дасягнуў чагосьці, а пра іншых — дамогся?**

**— Ну вось глядзі, сынок. Калі ты ўбачыш высока на дрэве яблык, палезеш за ім і сарвеш яго, то ты яго дасягнуў, а калі адлупіў малодшага брата і адабраў у яго яблык — значыць, дамогся.**

Хацеў бы звярнуцца да стваральнікаў смартфонаў: калі вашы апараты без майго дазволу самі сябе абнаўляюць і ўсталёўваюць дадаткі... то маглі б яны самі ж зараджацца і папаўняць свой баланс?!

**Калі ўсе справы, запланаваныя на сёння і назаўтра, перанесці на паслязаўтра, то ўтворацца два свабодныя дні.**




Даты | Падзеі | Людзі

### 4 САКАВІКА

У краіне

**1871** год — нарадзіўся (Полацк) Барыс Рыгоравіч Галёркін, расійскі інжынер і навуковец у галіне тэорыі пругкасці, інжынер-генерал-лейтэнант, акадэмік АН СССР, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі РСФСР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР.



**1921** год — нарадзіўся Эдуард Станіслававіч Куфко, беларускі мастак.

**1931** год — нарадзілася Валянціна Леанідаўна Рахленка, піяністка, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Адна са стваральніц фартэпіяннай школы Беларусі.

**1936** год — нарадзілася Вольга Фёдараўна Нячай, беларускі кіназнавец, доктар мастацтвазнаўства, прафесар.

**1951** год — нарадзіўся Алег Георгіевіч Давыдзенка, вучоны ў галіне малекулярнай генетыкі і селекцыі раслін, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар біялагічных навук, прафесар. Правёў буйнамаштабныя даследаванні генетычнага полімарфізму карэннага насельніцтва Беларусі, што дазволіла атрымаць дадатковую інфармацыю аб паходжанні і старажытнай гісторыі беларускага народа.

**1991** год — выйшла ў эфір інфармацыйная праграма «Радыёфакт».

У свеце

**1926** год — нарадзіўся Ігар Аляксандравіч Пакроўскі, расійскі архітэктар, народны архітэктар СССР, правадзейны член Расійскай акадэміі архітэктуры і будаўнічых навук, Міжнароднай акадэміі архітэктуры, народны архітэктар СССР. Стварыў грамадскія збудаванні і станцыі метро, дзелавыя цэнтры і творы царкоўнага дойлідства. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, Прэміі Прэзідэнта РФ.

У гэты ж дзень упершыню ў СССР для прамысловай разведкі марскога звера была прыменена марская авіяцыя.



**1946** год — нарадзіўся Вадзім Васілевіч Якаўлеў, расійскі акцёр тэатра і кіно, народны артыст РСФСР.

Так гаварыў...

**СТАНІСЛАЎ ЕЖЫ ЛЕЦ:**

*«Тыя, хто надзеў на вочы шоры, павінны памятаць, што ў камплект уваходзяць яшчэ цуглі і пуга».*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.
прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 647.
Нумар падпісаны ў 19.30 3 сакавіка 2021 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12